"ДОБРАСУСЕДСТВА–2002"
ПЕРСПЕКТЫВЫ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА 2 стар.

АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ
КРУГАВАРОТ ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ 3 стар.

ЛЁСЫ
Кастусь КЕРНАЖЫЦКІ — РЫЦАР ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ 4 стар.

РАДАВОД
ГЕАМЕТРЫЯ СПАДЧЫННАСЦІ 5 стар.

СЯМЕЙНЫЯ АБРАДЫ
ПРОВАДЫ Ў АРМІЮ 5 стар.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ. АРГЕНЦІНА
У БУЭНАС-АЙРЭСЕ ЎШАНОЎВАЮЦЬ Янку КУПАЛУ І Якуба КОЛАСА 6 стар.

БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ
"СВІТАНАК" ВА ЎЗБЕКІСТАНЕ 6 стар.

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА
З ЛІРЫЧНЫХ ЗАПІСАЎ Янкі БРЫЛЯ 7 стар.

УРАЖАННІ
СПЫНІСЯ, ІМГНЕННЕ 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі
Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

30 кастрычніка 2002 года. № 44 (2810) Цана 149 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

АДНАВІЦЬ ПАКУПНУЮ ЗДОЛЬНАСЦЬ

Згодна з данымі Міністэрства статыстыкі, сярэдняя заработная плата рабочых і служачых склала ў верасні 216 829 рублёй (у жніўні – 213 тысяч), што прыкладна адпавядае 116,5 долара ЗША. Але не сакрэт, што працаўнікі народнай гаспадаркі зарабляюць больш за работнікаў бюджэтнай сферы.

Як стала вядома карэспандэнту "Голасу Радзімы", зараз у Міністэрстве эканомікі абмяркоўваюць магчымасць павышэння са снежня 2002 года памеру тарыфаў стаўкі першага разраду работнікаў бюджэтнай сферы. Гэта мяркуецца зрабіць з улікам паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на гэты год. Цяпер у краіне рэалізуецца комплекс мер па ўдасканаленні дзяржаўнага рэгулявання. Ставіцца задача павялічыць пакупную здольнасць заработнай платы.

СУСТРЭЧА НЕ АДБЫЛАСЯ

Візіт дэпутата Дзяржаўнай думы Расійскай Федэрацыі, лідэра Саюза правых сіл Барыса Нямцова ў Мінск быў нядоўгім. У аэрапорце яго сустрэлі прадстаўнікі праваахоўных органаў і адправілі назад у Маскву.

Па афіцыйных даных, Барысу Нямцову было прапанавана пакінуць Беларусь за дзейнасць, накіраваную на нанясенне шкоды дзяржаўным інтарэсам краіны.

Разам з Нямцовым у Мінск прыляцелі віцэ-спікер Дзярждумы Расіі Ірына Хакамада і маскоўскі палітолаг Сяргей Маркаў, якім не было прад'яўлена ніякіх прэтэнзій, але яны самі прынялі рашэнне вярнуцца ў Маскву разам з Барысам Нямцовым.

Маскоўскія госці павінны былі прыняць удзел у міжнароднай канферэнцыі, арганізаванай аналітычным цэнтрам "Стратэгія", тэма абмеркавання — "Беларусь—Расія: новая інтэграцыя".

ГАРАНТЫЯ – СТАГОДДЗЕ

Маналітныя масты ўпершыню ў краіне пачалі будаваць дарожнікі прадпрыемства "Мінскаблдарбуд".

Новая тэхналогія робіць больш таннай будаўніцтва прыкладна на 30–40 працэнтаў, бо бетон рыхтуецца ў спецыяльнай упакоўцы на месцы ўзвядзення моста і патрабуецца яго значна менш. Ужо з'явіўся першы такі мост у Салігорскім раёне. Цяпер у стадыі праектавання яшчэ два збудаванні ўдасканаленай канструкцыі. Такія масты не толькі эканамічныя, але прыгожыя і даўгавечныя. Многія са зборных жалезабетонных канструкцый ужо праз 20 гадоў патрабуюць капітальнага рамонту, у той час як маналітныя разлічаны на 100 гадоў.

СЯРОД МАСКОЎСКІХ ЗАЛОЖНІКАЎ БЫЛІ БЕЛАРУСЫ

Беспрэцэдэнтная тэрарыстычная акцыя ў Маскве па захопу заложнікаў у тэатральна-канцэртнай зале выклікала з боку праваахоўных органаў Беларусі шэраг экстранных мер, накіраваных на павышэнне бяспекі беларускіх грамадзян і ўзмацненне кантролю за асобамі, якія прыбываюць у краіну. Тым больш, што сярод заложнікаў знаходзілася 10 беларускіх грамадзян. Адна беларуская заложніца загінула.

ДАПАМОГУЦЬ ШВЕДЫ

Міжнародная фінансавая карпарацыя распачынае ў Беларусі яшчэ адзін праект, накіраваны на падтрымку малога і сярэдняга бізнесу.

Ён называецца "Развіццё аб'яднанняў малога бізнесу ў Беларусі", а фінансаваць гэты праект узялося Шведскае ўпраўленне міжнароднага развіцця і супрацоўніцтва SIDA.

Праект дапаможа невялікім беларускім прадпрыемствам знайсці партнёраў у Швецыі і тым самым замацаваць інтарэсы айчыннага бізнесу на міжнародным узроўні.

ПЕРАБЛЫТАЎ УНУЧКУ

Здарыўся гэты кур'ёзны выпадак у гарадскім пасёлку Тураў Жыткавіцкага раёна. Тут з дзіцячага садзіка таямніча знікла трохгадовая Даша.

На шчасце, нічога крымінальнага не адбылося. У ходзе пошукаў дзяўчынкі ўчастковыя інспектары і міліцыянер патрульна-паставой службы РАУС знайшлі дзіця раніцай наступнага дня ў доме мясцовага пенсіянера. Як высветлілася, апошні забраў яе з дзіцячага садзіка памылкова... Замест сваёй унучкі.

Падрыхтавала Ларыса ЛАЗАР.

віншуем!

ЗНОЎ ПЕРШАЯ!

У Брэсце ўрачыста сустракалі дзесяцігадовую школьніцу з горада Высокае Камянецкага раёна, выхаванку дзіцячага ўзорнага калектыву эстраднага танца "Непаседы" Расноўскага дома культуры Аляксандру ШКУРДОДУ.

Яна вярнулася пераможцай з V Сусветнага чэмпіянату выканальніцкіх відаў мастацтва, які праходзіў у пачатку кастрычніка ў Лос-Анджэлесе. Саша ў восем гадоў у Кіеве ўжо заваявала званне "Міні-Міс Свету-2000". А цяпер зноў пакарыла сэрцы журы і гледачоў і атрымала залатыя медалі ва ўсіх чатырох намінацыях сярод канкурсантаў ад 5 да 16 гадоў. А менавіта "лірычны танец", "сучасны танец з элементамі акрабатыкі", "дэманстрацыя вячэрняй сукенкі" і "фотамадэль". Тым больш значная перамога дзяўчынкі з Беларусі, што ў чэмпіянаце прынялі ўдзел каля дзвюх тысяч удзельнікаў з 17 краін, у тым ліку 400 амерыканскіх дзяцей.

Фота Рамана КАБЯКА, БелТА.

ЧЫТАЙЦЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» Ў ІНТЭРНЭЦЕ!
http://golas.promedia.by

спорт

КАМП'ЮТЭРНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

У Мінску праходзяць выстава "Перспектыўныя тэхналогіі і сістэмы 2002" і Міжнародны кубак PTS 2002 па камп'ютэрным спорце.

Правядзенне камп'ютэрных турніраў — даволі распаўсюджаная з'ява. На Беларусі іх прайшло нямала. Але колькасць карыстальнікаў камп'ютэраў і аматараў гульняў з кожным днём расце. Акрамя таго камп'ютэрныя гульні летась прызнаны відам спорту. Вялікія турніры па камп'ютэрных гульнях праводзяцца ўжо на працягу трох гадоў. Праўда, беларусы яшчэ не паспелі гучна заявіць пра сябе. Каб паспрыяць паляпшэнню сітуацыі, створана грамадскае аб'яднанне «Федэрацыя камп'ютэрнага спорту» (ФКС).

Адным з першых крокаў створанай арганізацыі стала падрыхтоўка да правядзення міжнароднага кубка на выставе "Перспектыўныя тэхналогіі і сістэмы: інфарматыка, тэлекамунікацыі, бяспека". Кубак пройдзе на тэрыторыі Цэнтра лічбавага сусвету. Па словах намесніка старшыні ФКС Максіма Мамонава, гульні адбіраліся для кубка па прынцыпу масавасці. Ён жа актыўна выступіў у абарону гульняў, запэўніваючы, што не ўсе з іх маюць тэматыку "Ідзі і забі". М.Мамонаў рабіў спробу даказаць станоўчы ўплыў спорту — забавы на азнаямленне з англійскай мовай, тэхнікай, праграмным забеспячэннем камп'ютэра. Больш таго — з часам у нашай краіне будуць праводзіцца турніры па інтэлектуальных гульнях.

Для правядзення сёлетняга кубка была распрацавана спецыяльная сістэма рэйтынгавых адборачных турніраў. Характэрна, што апошнія праводзіліся не толькі ў сталіцы, але і на перыферыі.

Па словах Дзмітрыя Дзвярніцкага, старшыні Федэрацыі камп'ютэрнага спорту Беларусі, у Мінску працуе шмат камп'ютэрных клубаў, але элітарных не больш за 10. ФКС збіраецца садзейнічаць культуры арганізацыі камп'ютэрнага спорту.

Алена СПАСЮК.

НАДЗЕІ НЕ СПРАЎДЗІЛІСЯ

Насуперак прагнозам і надзеям, беларускія веласіпедысты не прывезлі медалёў з чэмпіянату свету, які праходзіў у бельгійскім Зольдэры.

Усе шансы на медаль мела наша галоўная надзея — Зінаіда Стагурская. Але незадоўга да фінішу Зінаіда на вялікай хуткасці не пазбегла сутыкнення з адной з саперніц. А лепшага выніку змагла дабіцца Вольга Гаева. У яе дзевятая пазіцыя з адставаннем 18 секунд ад лідэра.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

сацыяльны ракурс

Фота БелТА.

СПРАВЫ "САРДЭЧНЫЯ"

Першых пацыентаў прыняло новае аддзяленне рэабілітацыі хворых, якія перанеслі аперацыі на сэрцы, адкрытае ў клініцы НДІ радыяцыйнай медыцыны і эндакрыналогіі ў Аксакаўшчыне.

Аддзяленне зможа прыняць да сарака пацыентаў, якія паступяць з цэнтра "Кардыялогія" ў Мінску. Апякаць іх будуць высокакваліфікаваныя спецыялісты-кардыёлагі, метадысты лячэбнай фізкультуры, псіхолагі і псіхатэрапеўты.

Аддзяленне пабудавана за кошт сродкаў Камчарнобыля, а аснашчана за кошт сродкаў, атрыманых ад платных паслуг клінікі.

Хворыя будуць паступаць сюды на 6–9-ты дзень пасля аперацыі на сэрцы і 10–20 дзён праходзіць курс рэабілітацыі. Гэта дасць магчымасць "разгрузіць" кардыяцэнтр і павялічыць колькасць аперацый.

На адкрыцці прысутнічаў старшыня Камчарнобыля Уладзімір ЦАЛКО, спецыялісты цэнтра "Кардыялогія".

НА ЗДЫМКУ: у час адкрыцця аддзялення.

эксклюзіў

"АФГАНЦЫ" ГАТОВЫ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ ТЭРОРУ

У Маскве ў Доме Саюзаў прайшла Міжнародная канферэнцыя "Ветэраны войн СНД супраць экстрэмізму і тэрарызму", арганізаваная Камітэтам па справах воінаў-інтэрнацыяналістаў пры Савеце кіраўнікоў дзяржаў – удзельніц Садружнасці.

На канферэнцыю прыбыло 350 воінаў-"афганцаў" і ўдзельнікаў іншых ваенных канфліктаў з усіх краін СНД. Дэлегацыю з Беларусі ўзначаліў Уладзімір Баршчоў.

На канферэнцыі прыняты зварот да Антытэрарыстычнага цэнтра Садружнасці, кіраўнікоў сілавых міністэрстваў і ведамстваў дзяржаў, каб устанавіць больш цеснае ўзаемадзеянне з саюзамі і аб'яднаннямі ветэранаў баявых дзеянняў з мэтай больш эфектыўнага скарыстання іх патэнцыялу ў барацьбе з тэрарызмам на ўсёй прасторы СНД і рабоце па сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі ахвяр тэрору і ліквідацыі яго наступстваў.

Мікалай ЛЯБЕДЗІК.

Масква—Мінск.

наша марка

БЕЛАРУСКІ БРЭНД-2002

Стартаваў другі нацыянальны конкурс «Брэнд года 2002». З 20 верасня пачаўся збор заявак на ўдзел і быў адкрыты доступ да сайта конкурсу. Правядзенне гэтага спаборніцтва – адзін з фактараў, які дае магчымасць вызначыць узровень развіцця канкурэнтаздольнасці і канкурэнтнага асяроддзя.

У гэтым годзе спаборніцтвы будуць праходзіць сярод брэндаў, якія прадстаўляюць 26 таварных груп, вылучаных на аснове маркетынгавых даследаванняў. Пераможцаў вызначыць міжнароднае журы па выніках ацэнак прафесійных пакетаў прэзентацыі брэндаў у шасці намінацыях. Новаўвядзеннем гэтага конкурсу з'яўляецца вылучэнне ў асобную групу брэндаў, якія адносяцца да тыпу карпаратыўных і прадстаўляюць не адзін тавар або паслугу, а цэлае прадпрыемства — «носьбіта» брэнда.

Да спаборніцтва на званне самага эфектыўнага дэбютанта «Адкрыццё года» запрашаюцца гандлёвыя маркі, выпушчаныя на рынак у 2001–2002 гадах. Найбольш удалы варыянт адлюстравання нацыянальнай культурна-гістарычнай спадчыны ў выяве беларускай гандлёвай маркі будзе адзначаны прысуджэннем Гран-пры ў намінацыі «Брэнд Спадчына». У намінацыі «Brand.by» пераможа самае прафесійнае прадстаўленне айчыннай гандлёвай маркі ў сетцы Інтэрнэт. Галоўным аб'ектам ацэнкі будзе вэб-сайт і стратэгія яго прасоўвання. «Брэнд Экспарт» засноўваецца для беларускіх кампаній, якія працуюць на знешніх рынках, чыя стратэгія прасоўвання аказалася найбольш прафесійнай. «Брэнд Профі» мяркуе ўдзел гандлёвых марак, якія існуюць на рынку не менш як 3 гады. У ацэнцы «Самага крэатыўнага брэнда» будзе зроблены акцэнт на арыгінальнасці творчай ідэі.

Упершыню ў краіне ў рамках конкурсу праводзіцца маштабны маніторынг айчыннага рынку для вызначэння спажывецкіх пераваг у вялікай колькасці таварных груп. У гэтым годзе будуць прысуджацца дзве намінацыі спажывецкага журы — «Самы лепшы брэнд» і «Набытак рэспублікі». Пераможцы стануць вядомыя ў выніку агульнарэспубліканскага апытання.

Галіна ВІР.

супрацоўніцтва

ПА ЗАКОНАХ ДОБРАСУСЕДСТВА

У Мінску адбыўся традыцыйны, восьмы па ліку, беларуска-польскі семінар "Добрасуседства-2002". Актыўны ўдзел у яго падрыхтоўцы прынялі Міністэрства эканомікі Польшчы, Міністэрства замежных спраў Беларусі, Гандлёва-прамысловыя палаты дзвюх краін, Гандлёва-эканамічны аддзел польскага пасольства, Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў, а таксама шэраг іншых арганізацый. На семінар былі запрошаны прадстаўнікі дзелавых колаў Беларусі і Польшчы.

Як адзначалі арганізатары гэтага мерапрыемства, мэтай мінскай сустрэчы з'яўляецца не толькі абмен думкамі паміж беларусамі і палякамі па актуальных пытаннях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, але і наладжванне прамых кантактаў паміж суб'ектамі гаспадарання.

Удзельнікам семінара была прадастаўлена магчымасць наведаць свабодную эканамічную зону "Мінск" і пазнаёміцца з вопытам яе работы, прадстаўнікамі Беларускай чыгункі, кіраўнікамі шэрага ведамстваў, у тым ліку з міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання. Гэтыя сустрэчы і перамовы, безумоўна, павінны садзейнічаць умацаванню двухбаковых кантактаў паміж краінамі-суседзямі.

На сённяшні дзень, як вядома, Беларусь і Польшча рэалізуюць розныя стратэгічныя мэты: наша суседка ўступіла ў НАТО, а зараз рыхтуецца стаць членам Еўрапейскага Саюза. Беларусь выбрала іншы шлях, аддаўшы прыярытэт стварэнню агульнай Саюзнай дзяржавы з Расіяй. Але ўсё гэта, лічаць удзельнікі семінара, не павінна тармазіць добрасуседскія адносіны, што маюць старажытныя гістарычныя карані. Па словах міністра эканомікі Польшчы Анджэя Шараварскага, сустрэча прадстаўнікоў польскага і беларускага бізнесу павінна стаць штуршком для пошуку новых рашэнняў, якія будуць садзейнічаць умацаванню двухбаковых кантактаў.

"У нас ёсць вельмі спрыяльныя ўмовы ўзаемадзеяння: сумесная граніца, добрае веданне рынкаў суседзяў, эканамічны рост, які назіраецца і ў Польшчы, і ў Беларусі, — гаворыць Анджэй Шараварскі. — У нашай краіне добра развіваецца рыначная эканоміка: паспяхова дзейнічае прыватны сектар, асабліва малы і сярэдні бізнес. Перспектыва блізкага ўступлення ў Еўрапейскі Саюз павялічыла ўзровень даверу Захаду, які жадае размяшчаць у краіне ўсё большы капітал. Праўда, з 2001 года ў нас некалькі знізіліся эканамічныя паказчыкі, у тым ліку ў прамысловасці, будаўніцтве, транспарце, а рост ВУП у мінулым годзе склаў толькі 1 працэнт. Але польскі ўрад прыняў праграму, якая дапаможа краіне стаць на шлях хуткага развіцця. Асобую ўвагу мы надаём супрацоўніцтву з усходнімі суседзямі, у тым ліку з Беларуссю. І нас вельмі радуе, што беларуская эканоміка перайшла ў стадыю эканамічнага росту".

Анджэй Шараварскі падкрэсліў, што ўступленне яго краіны ў ЕС павінна станоўча адбіцца на развіцці беларуска-польскага супрацоўніцтва, бо змяненне прававой базы будзе звязана са зніжэннем таможных ставак, а пасля перасячэння Буга беларускія тавары змогуць свабодна рухацца па еўрапейскай тэрыторыі. "Што ж тычыцца цяперашняга стану нашага супрацоўніцтва, мы ацэньваем яго як даволі сціплы, што не адпавядае магчымасцям бакоў", — лічыць польскі міністр.

Аб неабходнасці ліквідаваць існуючыя паміж суседзямі эканамічныя бар'еры гаварыў намеснік міністра замежных спраў Беларусі Аляксандр Міхневіч. У той жа час ён падкрэсліў, што за апошні год паміж дзвюма краінамі кантакты ў эканамічнай сферы значна актывізаваліся. "Мы заўсёды разглядалі Польшчу як аднаго з нашых стратэгічных партнёраў. І эканамічныя паказчыкі сведчаць, што так яно і ёсць, — гаворыць Аляксандр Міхневіч. — Польшча ўваходзіць у першую пяцёрку нашых гандлёвых партнёраў.

Дарэчы, Беларусь экспартуе ў гэту краіну калійныя ўгнаенні, прадукты нафтаперапрацоўкі, сродкі транспарту, складаную тэхніку. Як адзначыў намеснік міністра, па экспартных пазіцыях Беларусь зараз займае 30-е месца ў свеце, і ў дзяржавы на гэты конт ёсць даволі амбіцыёзныя планы далейшага эканамічнага росту, што напрамую звязана з пашырэннем знешнеэканамічнай дзейнасці.

Зараз у краіне працуюць 502 прадпрыемствы з польскім капіталам, і іх колькасць можа значна вырасці, бо гэтаму будуць спрыяць стабільнае заканадаўства і новы інвестыцыйны кодэкс. Па новых правілах гульні будзе дзейнічаць і фонд падтрымкі экспарту, які будзе аказваць дапамогу ўсёй інфраструктуры, а не толькі асобным праектам. "Плануюцца новыя падыходы ў сістэме страхавання знешнеэканамічных аперацый, — адзначыў А.Міхневіч. — І тут нам, безумоўна, ёсць чаму павучыцца ў палякаў. Цікавіць нас вопыт суседзяў і ў сферы падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу. Такіх мер патрабуе само жыццё, а таксама будучае далучэнне Беларусі да Сусветнай гандлёвай арганізацыі".

Гаворачы аб уступленні Польшчы ў ЕС, Аляксандр Міхневіч падкрэсліў, што беларускі бок стараецца ўзважыць усе магчымыя наступствы для двухбаковых гандлёвых адносін такога кроку суседзяў. "Я б ахарактарызаваў гэты працэс як неадназначны. Таму мы імкнемся выявіць негатыўныя з'явы, якія могуць узнікнуць у будучыні. І калі іх нельга пазбегнуць, то трэба падумаць аб змякчэнні гэтых наступстваў", — адзначае беларускі прадстаўнік. Беларускі бок хвалюе, напрыклад, што існуючыя ў Еўропе антыдэмпінгавыя санкцыі на айчынныя тавары могуць у будучыні распаўсюджвацца і на польскую тэрыторыю, што нашкодзіць і беларусам, і палякам. Не сакрэт, што дзеючыя паміж нашымі краінамі пагадненні значна шырэйшыя ў параўнанні з комплексам дакументаў, падпісаных Беларуссю з Еўрапейскім Саюзам. "Я думаю, што ў бліжэйшы час мы зможам абмеркаваць гэтыя пытанні не толькі на двухбаковым узроўні, але і з удзелам прадстаўнікоў ЕС", — адзначыў Аляксандр Міхневіч.

На семінары выступілі кіраўнікі свабодных эканамічных зон Беларусі, дыпламаты, прадстаўнікі банкаў і страхавых арганізацый, таможных службаў, органаў сертыфікацыі і стандартызацыі, бізнесмены. На думку ўдзельнікаў форуму, дыскусія і выказаныя на ёй прапановы будуць садзейнічаць далейшай актывізацыі ўзаемавыгадных беларуска-польскіх эканамічных адносін.

Ларыса ЛАЗАР.

попыт

Фота БелТА.

ДЗЯРЖЫНСКІЯ ДАЛІКАТЭСЫ

Работнікі Дзяржынскай бройлернай птушкафабрыкі, нягледзячы на аб'ектыўныя цяжкасці, змаглі захаваць паголоўе птушкі і застацца рэнтабельным прадпрыемствам.

НА ЗДЫМКУ: птушніца Ніна КУЛЬТАВАЯ.

здарэнні

ПАЖАР НА ГАЗАПРАВОДЗЕ

Абрыў праводу на ЛЭП-110 справакаваў пажар на трубаправодзе прадпрыемства «Полацкгаз».

Провад абарваўся з-за размацавання ізалятараў на лініі электраперадач і ўпаў на ахоўную сетку ўчастка трубы, якая ідзе ад размеркавальнай станцыі на Наваполацкую ЦЭЦ. У выніку кароткага замыкання ў трубе дыяметрам 1 020 міліметраў з рабочым ціскам 11,8 атмасферы прагарэла 8–10 міліметраў. Утварыўся факел, які дасягаў 4 метраў.

Брыгада «Гаргаза» перакрыла засаўку на трубаправодзе. Аднак у Наваполацк газ працягваў паступаць, забеспячэнне горада ажыццяўлялася па абводнай лініі. Праз пяць з палавінай гадзін пажар удалося ліквідаваць і пачаць зварачныя работы. Да поўнага падачы газу ў горад у звычайным рэжыме была адноўлена.

Канстанцін СЯЎРУК.

аспект праблемы

КРУГАВАРОТ ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ

Пад эгідай Міністэрства энергетыкі Беларусі прайшла VII міжнародная спецыялізаваная выстава "Энергетыка, экалогія, энергазбераженне". Каля ста ўдзельнікаў выставы прадстаўлялі сваю прадукцыю, ідэі і праекты.

Спецыялісты абменьваліся думкамі, дзяліліся напрацаваным вопытам і перспектывамі развіцця галіны ў сферах энергазабеспячэння, энергазбераження і экалогіі. Разглядаючы існуючую сістэму энерга- і цеплазабеспячэння, прыходзім да несуцяшальнай высновы: страты электраэнергіі і цепларэсурсаў перавышаюць разумныя межы, а перспектыўныя прапановы па іх зберажэнні, на жаль, укараняюцца далёка не ўсімі. Вельмі цяжка мяняюцца стэрэатыпы мышлення. Па даных Дзяржаўнай энергетычнай праграмы Рэспублікі Беларусь на 1990 год, удзельныя затраты ўмоўнага паліва на чалавека ў год па СНД складаюць 7,3 т.у. п/чал., па Беларусі — 5,4, па развітых краінах — 1,42 т.у. п/чал. Такая розніца спажывання паліва абумоўлена недасканаласцю энергетычных вытворчасцей, невытворчымі стратамі, а таксама больш суровымі кліматычнымі ўмовамі. Істотна адрозніваецца Беларусь і вытворчасцю электраэнергіі на душу насельніцтва. У ЗША — 12 240 квт. г/чал., ФРГ — 7 800 квт. г/чал., Францыя — 5 800 квт. г/чал., Беларусь — 4 800 квт. г/чал.

Такім чынам, спажыванне паліўных рэсурсаў на душу насельніцтва ў нашай краіне амаль у 4 разы вышэйшае за сярэднесусветнае, а выпрацоўка электраэнергіі ў 2,5–1,5 раза ніжэйшая, чым у асноўных індустрыяльна развітых краінах. Аналіз сітуацыі паказвае, што ў Беларусі асноўная прамысловая вытворчасць недастаткова арыентавана на неабходнасць і патрэбы, а ў большай ступені скарыстоўваецца перанасычанымі энергаёмістымі і тэхналагічна састарэлымі вытворчасцямі. Тым больш, што энергетыка Беларусі базіруецца на імпарце энерганосьбітаў (90 працэнтаў нафты, 95 працэнтаў вугалю, 25 працэнтаў электраэнергіі). Мясцовыя энергарэсурсы (торф, драўніна) займаюць нязначнае месца, а некаторыя (гаручыя сланцы) наогул не скарыстоўваюцца. Расход энерганосьбіта па Беларусі: прамысловая вытворчасць — 65 працэнтаў, транспарт — 62, сельгасвытворчасць — 10, камунальна-бытавыя патрэбы — 18,8 працэнта. Калі паказчыкі скарыстання ЦЭР на электрастанцыях яшчэ супаставімыя з сусветнымі, то ў прамысловасці і быце на 50–60 працэнтаў, а ў сельскай гаспадарцы ў 3–4 разы ніжэйшыя за сярэднесусветныя.

Параўноўваючы характарыстыкі энергаёмістасці прадуктаў у свеце і Беларусі, можна таксама адзначыць, што наша эканоміка спажывае ў 2–2,5 раза больш энергіі на адзінку прадукцыі, чым эканомікі ЗША і Еўропы. Вось таму з асаблівай вастрынёй узнікаюць пытанні, вырашэнне якіх дапаможа ў кароткія тэрміны ўкараніць комплекс мер па энерга- і рэсурсазбераженні. У гэтай сувязі ў першую чаргу неабходна звярнуць увагу на скарачэнне страт у працэсе здабычы, перапрацоўкі і транспарціроўкі энергетычнай сыравіны; паляпшэнне структуры і тэхналогіі ў сферы вытворчасці, пераўтварэння і размеркавання энергіі і паліва; рацыяналізацыю і аптымізацыю развіцця сістэм электра- і цепласпажывання; удасканаленне тэхналогіі вытворчых працэсаў; павелічэнне выкарыстання другасных энергетычных і цеплавых рэсурсаў.

Ушчыльную з вырашэннямі вышэйпералічаных пытанняў звязаны і праблемы экалагічнай бяспекі краіны. Экалагічныя праблемы ў Беларусі добра вядомыя: забруджванне атмасферы выкідамі прамысловых прадпрыемстваў, аўтатранспарту; назапашванне прамысловых адходаў рознай катэгорыі небяспекі, у тым ліку таксічных і радыеактыўных; скарачэнне сельскагаспадарчых земляў з-за аварыі на Чарнобыльскай АЭС у выніку радыеактыўнага забруджвання; спусташэнне і забруджванне паверхневых водных крыніц і падземных гарызонтаў, выкліканых парушэннем гідрагеалагічных умоў рэгіёна Беларусі; тэхналагічная дэградацыя ландшафтаў.

Асноўныя крыніцы забруджвання навакольнага атмасфернага паветра — прамысловыя прадпрыемствы, аўтатранспарт і аб'екты энергетыкі. Гэтымі крыніцамі ў атмасферу штогод выкідваецца 2 080 000 тон кампанентаў. У складзе выкідаў аксіду вугляроду 54 працэнты, дыаксіду серы 15, вуглевадародаў 12, аксіду азоту 9 працэнтаў, свінец бензапірэн. Значнае забруджванне дае энергетычны комплекс, бо адначасова з электрастанцыямі ў Беларусі працуе 22 500 кацельных на вадкім і цвёрдым паліве. Абмежаванасць энергетычных рэсурсаў і безабароннасць прыроды прымушаюць нас сур'ёзна пераглядаць адносіны да вытворчасці і спажывання энергіі, распрацоўваць і ўкараняць эгергазберагаючыя тэхналогіі. Неабходна вывучаць і максімальна скарыстоўваць экалагічна чыстыя крыніцы энергіі, якія аднаўляюцца. Перш за ўсё энергію сонца і ветру. У Германіі ветраэнергетыка дае ў год больш за 500 мільярдаў кілават/гадзін электраэнергіі. Для параўнання: у Беларусі за 2001 год агульнае спажыванне электраэнергіі склала 33,1 мільярда кілават/гадзін. Беларусь — практычна адзіная ў Еўропе краіна, дзе энергія ветру не скарыстоўваецца ў гаспадарчых мэтах.

Дык ці патрэбна Беларусі ветраэнергетыка? Згодна з даследаваннямі беларускіх энергетыкаў і кліматолагаў, ветраэнергетычныя рэсурсы нашай краіны ацэньваюцца ў 223,6 мільярда кілават/гадзін. Значыць, рацыянальнае размяшчэнне ветраэнергетычнага абсталявання, сумешчанага з цепла- і гідраэлектрастанцыямі, можа істотна зменшыць, калі не замяніць зусім, імпарт энергіі. Гэтыя даныя пацвярджаюцца даследаваннямі, праведзенымі ў 1996–1998 гадах спецыялістамі Дзяржкамгідрамета НПДП "Ветрамаш" і ДП "Белэнергасетпраект". Пры сярэднегадавой хуткасці ветру больш за 5 метраў у секунду поўнасцю задавальняюцца сусветныя патрабаванні камерцыйнай мэтазгоднасці ўкаранення ветраэнергетычнай тэхнікі. Такім чынам, ужо ў бліжэйшы час Беларусь можа пакрыць да 50 працэнтаў сваёй патрэбнасці ў энергіі, скарыстоўваючы толькі 10 працэнтаў прыдатнай для ветраэнергетычных мэт тэрыторыі. Ужо выяўлена 1 840 пляцовак для устаноўкі ВЭУ. Такія набліжаныя рэаліі сённяшняга дня. Разглядаць пытанні энергазбераження, экалагічных яго аспектаў без эканамічнага абгрунтавання, рэнтабельнасці і хуткай самаакупнасці канкрэтных праектаў немагчыма.

Што выгадней — вырабляць электраэнергію на ўласных магутнасцях ці імпартаваць яе? Цяпер кошт 1 кілават/гадзіны беларускай электраэнергіі 0,034 умоўнай адзінкі, а сярэдні кошт імпартнай кілават/гадзіны — 0,029 умоўнай адзінкі. Імпартуемая электраэнергія нібыта больш танная, але як гэта суадносіцца з энергетычнай бяспекай дзяржавы?

Ды і ці ўсе магчымасці скарыстаны для змяншэння страт і вытворчасці новых відаў энергіі? На ўсе гэтыя пытанні і спрабавалі адказаць удзельнікі выставы-кангрэса. Іх жа належыць разгледзець на трэцім з'ездзе энергетыкаў прадпрыемстваў Беларусі, які пройдзе ў Мінску 14–15 лістапада 2002 года. Прыведзеныя высновы тычацца агульнадзяржаўных праблем. А ці мала можна зрабіць у родным горадзе, вёсцы, доме, кватэры?

Вырашэнне пытанняў энергазбераження і вытворчасці экалагічна чыстых відаў энергіі на аснове перадавых дасягненняў тэхнікі і тэхналогій трэцяга тысячагоддзя дае кожнаму спажыўцу магчымасць на сваім лакальным месцы паспяхова вырашаць тыя ж пытанні, якія часткова, а часам і значна дазваляюць скараціць выдаткі на электра- і цеплаэнергію, для абслугоўвання свайго жылля без шкодных наступстваў. Гэта той жа кругаварот прыроды, дзе ўсё ўзаемазвязана. Культура = энергазбераженне + эканоміка + экалогія. Усё ў нашым жыцці — адзіны жыццёвы, гаспадарчы, вытворчы і культурны вузел.

Галіна АЛЯКСЕЕВА.

фотарэпартаж

КАМАРОЎСКІЯ МАТЫВЫ

Наведвальнікі Камароўскага рынку ў беларускай сталіцы атрымалі яшчэ адзін зарад станоўчых эмоцый, любуючыся новымі скульптурнымі кампазіцыямі вакол фантана, які ўжо стаў любімым.

Іх стваральнік мінскі скульптар Уладзімір Жбанаў. Персанажы вельмі незвычайныя: гэта "Бабуля, якая гандлюе семкамі", "Фатограф", (па задуме аўтара — "летапісец эпох") і "Дама з сабачкам".

НА ЗДЫМКАХ: скульптурныя кампазіцыі "Бабуля, якая гандлюе семкамі"; "Фатограф"; "Дама з сабачкам".

Фота БелТА.

сябры нашы меншыя

БЯЗДОМНЫЯ ЖЫВЁЛЫ НА ВУЛІЦАХ СТАЛІЦЫ

У Грамадскім прэс-цэнтры прайшоў "круглы стол" па праблеме будаўніцтва пунктаў прыёму і часовага ўтрымання бадзяжных жывёл. Галоўная думка, што прагучала: настаў час, калі ўтрыманне хатніх жывёл і стаўленне да бадзяжных павінна стаць цывілізаваным.

У Мінску толькі сабак зарэгістравана 18 764. І гэтая лічба далёкая ад рэальнай колькасці, якая перавышае афіцыйную ў некалькі разоў. Нягледзячы на патрабаванне заканадаўства рэгістраваць кошак, людзі, каб пазбегнуць выплаты падатку, наогул не робяць гэтага. Летась у Мінску з утрымальнікаў хатняй жывёлы было сабрана 175 мільёнаў 832 тысячы рублёў. Грошы размяркоўваюцца такім чынам: 85 працэнтаў з іх ідзе на будаўніцтва пункта прыёму і часовага ўтрымання бадзяжных жывёл, 15 працэнтаў — прадпрыемству "Спецкамунаўтатранс".

Неабходнасць існавання ў сталіцы пункта прыёму жывёл не выклікае ні ў кога сумнення.

Ён будуецца з сярэдзіны 2000 года. Па плану аб'ект уключыць у сябе ветэрынарную станцыю, аўтастаянку, гасцініцу для жывёл. Пакуль узведзены толькі сцены ветэрынарнай станцыі, зроблены фундамент вальераў для жывёл. Па словах Валерыя Фрэйтака, начальніка аддзела капітальнага будаўніцтва Галоўнага вытворчага ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінгарвыканкама, пры існуючых аб'ёмах фінансавання будаўніцтва расцягнецца на 3–4 гады. Пры гэтым пачне дзейнічаць толькі пункт прыёму жывёл. Пра гасцініцу пакуль гаворка не ідзе наогул. Сродкі, што збіраюцца ў якасці падатку на хатніх жывёл, значныя для тых, хто плаціць, і недастатковыя для правядзення работ.

Ёсць яшчэ адна акалічнасць. В.Фрэйтак гаворыць: "Штомесяц з пачатку будаўніцтва прыкладна 2 мільёны рублёў ідзе на падатак на зямлю. Мы звярталіся ў Мінгарвыканкам з просьбай вызваліць аб'ект ад зямельнага падатку. Але пытанне на нашу карысць не вырашана". Пакуль ідзе будаўніцтва, брыгады прадпрыемства "Спецкамунаўтатранс" па адлову бадзяжных жывёл штодзень выязджаюць на сваю працу. Летась было адлоўлена 12 716 жывёл. Пры гэтым выканана 3 166 заяў арганізацый. Па словах Аляксандра Гамбалеўскага, намесніка дырэктара "Спецкамунаўтатранса", праца ўспрымаецца людзьмі па-рознаму. Адны звяртаюцца са скаргамі на вялікую колькасць бадзяжных жывёл і патрабуюць іх адлову. Іншыя ж абвінавачваюць у адлове хатніх сабак. Апошняе з'яўляецца, як сцвярджае А.Гамбалеўскі, выпадковасцю. Існуе інструкцыя, якая прадугледжвае адлоў усіх жывёл, якія знаходзяцца на вуліцах без гаспадароў. Але сабак і кошак, што маюць ашыйнікі ці жэтоны рэгістрацыі, не адлоўліваюць.

Праблема бадзяжных жывёл у нашых суседзяў вырашаецца трохі па-іншаму. У Маскве ўсыпленне жывёл забаронена. Іх толькі стэрылізуюць. І пры адлове вядзецца дакладная рэгістрацыя, чаго ў Мінску няма. Хаця ў нас таксама імкнуцца вырашаць праблему цывілізавана. Будзе пункт прыёму жывёл — спыніцца іх знішчэнне. Магчыма, у дэпутатаў дойдуць рукі і да закона аб жывёлах, які плануецца разгледзець у 2004 годзе.

Ужо цяпер у Мінску 64 пляцоўкі і 89 месцаў для выгулу сабак. Але шчыльнасць забудовы ў горадзе такая, што размясціць іх сярод дамоў часта немагчыма. Так, у Цэнтральным раёне сталіцы 8 пляцовак, а неабходна 16. Сітуацыя прыводзіць да таго, што сабакі і каты гуляюць з гаспадарамі і без іх усюды, уключаючы дзіцячыя пляцоўкі. Патрэбны час, каб з'явілася ў нас звычка не выпускаць жывёл адных на вуліцу, а вялікіх сабак выгульваць толькі ў наморднiках. Ды і ў рэшце рэшт прыбіраць за імі, як гэта прынята ва ўсім цывілізаваным свеце. Пакуль жывёлы будуць з'яўляцца і разводзіцца ў кватэрах выпадкова і бяздумна, цяжка нешта гаварыць пра цывілізаваны і культурны падыход у справе іх утрымання.

Алена СПАСЮК.

лёсы

РЫЦАР ПІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

НЕВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ БІЯГРАФІІ ГІСТОРЫКА КАСТУСЯ КЕРНАЖЫЦКАГА

З гісторыкаў-беларусаў першай паловы XX стагоддзя Кастусь Кернажыцкі – адна са значных, яскравых постацей. Наперадзе Кернажыцкага можна паставіць хіба толькі Доўнар-Запольскага. Працы К.Кернажыцкага – важная вяха ў беларускай гістарыяграфіі. Праз 60 гадоў пасля смерці К.Кернажыцкага большасць з напісанага таленавітым вучоным не страціла навуковай каштоўнасці. Працы вытрымалі самае цяжкае выпрабаванне – выпрабаванне часам. Спадчына Кастуся Іванавіча высока ацэньваецца сучаснымі вучонымі-гісторыкамі.

Не трэба забываць, што Кастусь Кернажыцкі пражыў усяго толькі 39 гадоў, у тым ліку на волі – 35. А навуковая дзейнасць гэтага чалавека, не лічачы вучобы ў БДУ і аспірантуры, працягвалася ўсяго... шэсць гадоў.

На вялікі жаль, да цяперашняга часу жыццё і дзейнасць Кернажыцкага працягваюць заставацца амаль не даследаванымі. Толькі некалькі радкоў у энцыклапедыях і некалькі газетных і часопісных артыкулаў. А між тым, кароткае, але вельмі плённае жыццё гэтага чалавека, яго велізарны ўклад у гістарычную навуку, яго апантаная дзейнасць на карысць Бацькаўшчыны заслугоўваюць таго, каб імя К.Кернажыцкага стала шырокавядомым.

Пры напісанні данага артыкула былі выкарыстаны фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, успаміны людзей, што асабіста ведалі вучонага-гісторыка.

Канстанцін Кернажыцкі нарадзіўся 25 верасня 1902 года ў вёсцы Выдрынка (Выдрэнка) (а не Выдранка, як у энцыклапедыях. — Э.І.) Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні ў сям'і сельскага свяшчэнніка. Пасля трох гадоў вучобы ў земскай школе ў 1911 годзе ён паступіў у Гомельскае духоўнае вучылішча. З 1915 года Кастусь вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі. Паводле аўтабіяграфіі, Кернажыцкі закончыў тры класы гэтай навучальнай установы.

У 15-гадовым узросце Кастусь пачаў працаваць у ваенным стале Стаўбцоўскага валрэўкама, а пазней, у жніўні 1919 года, не дасягнуўшы яшчэ 17-ці гадоў, стаў настаўнікам Сталбунскай школы Гомельскага павета. У асабістай справе К.Кернажыцкага захавалася даведка наступнага зместу:

"Па існуючых звестках, у Свяцілавіцкім мясцкаме Саюза Рабасветы грамадзянін Канстанцін Іванавіч Кернажыцкі ў 1919/20 і ў 1920/21 навучальных гадах знаходзіўся ў якасці школьнага работніка ў Сталбунскай школе і ступені: летам 1921 года ліквідаваў непісьменнасць і займаў па выбары пасаду сакратара ў мясцкаме Саюза Рабасветы.

Старшыня Свяцілавіцкага мясцкама Саюза Рабасветы (подпіс)".

У ліпені 1921 года К.Кернажыцкі быў камандзіраваны Гомельскім павятовым аддзелам народнай асветы на беларускія лектарскія курсы ў горад Мінск.

І вось прайшло дзевяць месяцаў. Якіх толькі прадметаў ні вывучалі на курсах! Тут выкладалі беларускую мову і гісторыю беларускага пісьменства, гісторыю беларускага народа і методыку гісторыі, фізічную і эканамічную геаграфію Беларусі, гісторыю польскага пісьменства і польскую мову, польскую гісторыю і гісторыю расійскага пісьменства, расійскую гісторыю і методыку роднай мовы, методыку выкладання геаграфіі і агульнае краязнаўства. І ўсюды адзнака — "вельмі добра".

Па заканчэнні курсаў Кастусь Кернажыцкі прадставіў працу на тэму: "Прычыны ўзнікнення і распаўсюджвання на Беларусі езуітаў". Юнак паказаў, што ён валодае элементамі навуковага аналізу фактычных матэрыялаў.

У пасведчанні, выдадзеным 19-гадоваму выпускніку беларускіх лектарскіх курсаў 1 красавіка 1922 года, адзначалася:

"...На падставе гэтага Кернажыцкі Канстанцін Іванавіч, у якога ўжо ёсць закончаная сярэдняя адукацыя, мае права быць лектарам і настаўнікам па ўсіх прадметах беларусазнаўства".

Пад пасведчаннем Кернажыцкага, якое захоўваецца ў архіве, стаяць подпісы Народнага камісара асветы У.Ігнатоўскага, старшыні рады курсаў М.Пілятуховіча, загадчыка Беларускага аддзела Мялешкі, сакратара курсаў Апаценкі, лектараў М.Азбукіна, М.Грамыкі, А.Савіча, В.Іваноўскага, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі і іншых вядомых дзеячаў беларускай культуры.

Адначасова з вучобай на беларускіх лектарскіх курсах Кастусь восенню 1921 года паступіў на першы курс сацыяльна-гістарычнага аддзялення педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Скончыў гэта аддзяленне ў ліпені 1926 года.

Матэрыяльнае становішча многіх студэнтаў БДУ прымушала іх адначасова з вучобай працаваць. Менавіта так вымушаны быў паступіць на другім курсе і Кастусь Кернажыцкі, які з 5 верасня 1922 года быў прызначаны настаўнікам 3-й Савецкай школы Мінска і працаваў тут па 1930 год.

Сярод вучняў Кастуся Іванавіча была і будучая паэтэса Эдзі Агняцвет. Праз шмат гадоў яна напіша ў сваёй аўтабіяграфіі:

"Мне хочацца ўспомніць добрым словам і свайго першага настаўніка Канстанціна Іванавіча Кернажыцкага... Ён прыходзіў да нас і чытаў беларускія народныя казкі, вершы Купалы, Коласа, Багдановіча, байкі Крапівы. Мы слухалі, як зачараваныя. А пасля, калі ўжо самі навучыліся чытаць, не маглі ўявіць сабе жыцця без кнігі, без літаратуры...".

Выдатны вучоны-гісторык, першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта Уладзімір Пічэта ўжо з першых семінарскіх заняткаў па гісторыі Беларусі і гісторыі народнай гаспадаркі Беларусі прыкмеціў здольнага студэнта Кастуся Кернажыцкага. На самай справе, гэты юнак праявіў сябе з самага лепшага боку як у вучобе і першых кроках навуковай працы, так і ў грамадскіх справах.

Калі ў 1924 годзе паўстала пытанне аб прызыве К.Кернажыцкага ў Чырвоную Армію, у Камісію па адтэрміноўках па адбыванні воінскай павіннасці пры Нарваенкамаце Беларусі былі накіраваны хадайніцтвы з Наркамасветы БССР, рэктарата БДУ, дэканата педфака, грамадскіх арганізацый з просьбай даць Кернажыцкаму адтэрміноўку ад прызыву на ваенную службу.

15 красавіка 1924 года рэктар БДУ, прафесар У.Пічэта пісаў:

"Гэтым сведчу, што студэнт другога курса педагагічнага факультэта Кернажыцкі працуе ў мяне на семінары па гісторыі Беларусі з вялікім поспехам, і было б вельмі цяжка пазбавіцца ў даны момант ад каштоўнага ў будучыні навуковага работніка".

А дэкан педагагічнага факультэта, вучоны-гісторык з сусветным імем прафесар Мікалай Нікольскі адзначаў:

"...Канстанцін Іванавіч Кернажыцкі з'яўляецца адным з лепшых і акуратнейшых студэнтаў факультэта... Як прафесар, я ведаю тав.Кернажыцкага па сваім семінары (беларуская народная рэлігія), у якім ён з'яўляецца адным з найактыўнейшых і найакуратнейшых удзельнікаў; пададзеныя ім работы належаць да ліку лепшых, а яго ўдзел у спрэчках заўсёды сведчыць аб тым, што ён увесь час знаёміцца з матэрыялам па іншых тэмах, — з'ява, на жаль, выключная на семінарскіх занятках...".

Праз месяц у адпаведныя органы паступілі звесткі аб тым, што бацька Канстанціна Кернажыцкага — непрацоўны элемент, святар. Гэта пагражала яму адлічэннем з БДУ.

І тады на дапамогу здольнаму студэнту прыйшоў сам наркам асветы БССР Усевалад Ігнатоўскі, які адначасова быў членам праўлення і прафесарам БДУ, а галоўнае — ведаў Кастуся Кернажыцкага. У асабістай справе студэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта К.Кернажыцкага захоўваецца паручыцельства наркама:

"Тав.Кернажыцкі з бацькам не мае ніякай сувязі, з'яўляецца вельмі дзейным працаўніком асветы і да непрацоўнага элемента не можа быць прылічаны.

У.Ігнатоўскі (Наркамасветы)
1924. 21.IV".

У 1926 годзе Кастусь Кернажыцкі бліскуча абараніў дыпломную работу на тэму "Гаспадарка старостваў і іх эканамічнае становішча на Беларусі ў другой палове XVIII стагоддзя", якая амаль адразу была надрукавана ў "Працах Беларускага дзяржаўнага універсітэта".

У 1927–1930 гадах Кернажыцкі вучыўся ў аспірантуры педфака БДУ. Спачатку — на кафедры гісторыі народнай гаспадаркі Беларусі, а потым — на кафедры беларускай гісторыі. Яго навуковым кіраўніком быў адзін з заснавальнікаў беларускай гістарычнай навукі, вядомы вучоны-гісторык, акадэмік Уладзімір Пічэта, які лічыў яго самым таленавітым са сваіх аспірантаў.

Пасля заканчэння аспірантуры Канстанціна Іванавіча залічылі асістэнтам кафедры гісторыі народнай гаспадаркі факультэта народнай гаспадаркі. У 1930–1931 гадах Кернажыцкі працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН БССР і выкладчыкам Вышэйшага педагагічнага інстытута.

У 1934 годзе маладога вучонага зацвярджаюць у навуковай ступені кандыдата гістарычных навук і прызначаюць старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі.

Можна без усякага перабольшвання адзначыць, што ў залатую скарбніцу беларускай гістарычнай навукі ўвайшлі навуковыя працы К.Кернажыцкага "Аграрная рэформа ў Бабруйскім старостве і эканамічны стан яго насельніцтва з XVII да паловы XIX стагоддзя" (Мн., 1931), "Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной" (Мн., 1932), "Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII і першай палове XIX стагоддзя: (Да праблемы разлажэння феадалізму ў Беларусі)" (Мн., 1935).

У 1937 годзе вучоны быў арыштаваны, а ў 1939-м асуджаны на 8 гадоў зняволення. Кернажыцкі быў высланы ў Сібір.

Канстанцін Іванавіч памёр у бальніцы г.Канска Краснаярскага краю на 40-м годзе жыцця 28 лютага 1942 года.

Навуковая спадчына К.Кернажыцкага высока ацэньваецца сучаснымі беларускімі гістарыёграфамі. Менавіта ён стварыў грунтоўныя даследаванні па гісторыі Беларусі XVII–XIX стагоддзяў, абгрунтаваў (разам з Д.Дудковым) капіталістычны характар аграрнага ладу Беларусі пасля сялянскай рэформы 1861 года, быў адным са складальнікаў унікальнага зборніка дакументаў "Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах" (Т.1. Мн., 1936).

Кернажыцкі поўнасцю рэабілітаваны ў 1958 годзе. Яго жыццё і навуковая дзейнасць вартыя таго, каб іменем вучонага былі названы вуліцы і плошчы шэрага населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь.

Эмануіл ЮФЕ,

доктар гістарычных навук.

НА ЗДЫМКУ: Кастусь КЕРНАЖЫЦКІ (трэці справа ў другім радзе) сярод студэнтаў БДУ — удзельнікаў семінара па гісторыі Беларусі. 1924 г.

(Фота з архіва).

меркаванне

Алесь ПАШКЕВІЧ:

"САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ МОЖА ПАЧАЦЬ З ЧЫСТАГА АРКУША..."

Самае частае пытанне, якое задаюць журналісты новаму старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў – 30-гадоваму літаратару Алесю Пашкевічу: "Якія задачы ставіць перад сабой новае кіраўніцтва СБП?"

— Умоўна іх можна падзяліць на тры часткі. Па-першае, трэба разабрацца са скандальным развалам цэлых творчых калектываў рэдакцый "тоўстых" літаратурных часопісаў. Звярнуць увагу на ганарарную палітыку і кнігавыдавецкую справу наогул. Па-другое, варта наладзіць "прафсаюзную" падтрымку літаратараў. Мне было цяжка чуць, што многія пісьменнікі, якія жывуць у іншых гарадах, не прыехалі на з'езд толькі таму, што ў іх не было грошай на білет. І пытанні наладжвання кантактаў паміж творчымі аб'яднаннямі Беларусі, Украіны, Літвы, Польшчы і Расіі, праблемы ўзаемных перакладаў і выдання сумесных анталогій. Нарэшце, нядрэнна было б адкрыць у Беларусі калі не літінстытут, то хаця б літаратурныя курсы.

— Узрост кіраўніка Саюза пісьменнікаў падштурхоўвае на пытанне, ці паўплывае ён на палітыку СБП у адносінах да маладых літаратараў.

— Вядома, мы будзем падтрымліваць маладых! Наша галоўная задача — выявіць і не даць згаснуць талентам, якія могуць многае даць беларускай літаратуры і нашай краіне. Трэба шукаць магчымасць дапамагаць маладым аўтарам друкавацца, выдаваць кнігі...

— Ці будзе месца палітыцы ў дзейнасці СБП, ці зменяцца адносіны вашага творчага аб'яднання з уладамі?

— Пісьменнік і згодна са статутнымі патрабаваннямі, і прафесійна закліканы перш за ўсё займацца сваёй справай. СПБ — не палітычная партыя. І таму наш саюз павінен падтрымліваць усе дастойныя пачынанні дзяржавы ў сферы культуры.

Мне прадастаўлены вялікі шанс: Саюз пісьменнікаў можа пачаць жыццё з чыстага аркуша. І магчымасць гэту неабходна скарыстаць...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

захавай традыцыю

САМАБЫТНАЯ "ОЙРА"

Фота БелТА.

Другі год у Пружанах існуе харэаграфічны тэатр "Ойра", названы ў гонар аднайменнага танца. Яго ўдзельнікі — самадзейныя артысты, якія вырашылі сабраць і захаваць фальклорныя танцы Пружаншчыны. Ансамбль выконвае гэтыя кампазіцыі з запалам, самабытна.

НА ЗДЫМКУ: Алена МАРОЗ закончыла харэаграфічнае аддзяленне Пружанскай школы мастацтваў. Другі год яна танцуе ў калектыве.

радавод

ГЕАМЕТРЫЯ СПАДЧЫННАСЦІ

Мая прабабуля Вікторыя Гурэцкая пражыла восемдзесят гадоў і памерла ў тысяча дзевяцьсот семдзесят першым годзе. Але так і не авалодала пісьмом. Без фіксацыі звестак пра род няшмат інфармацыі можа захавацца. Дык які ж мой радавод?

Даведаўшыся пра мае хваляванні, тата сказаў: "А ці ведаеш, дачка, што ў тваіх жылах, магчыма, цячэ кроў Уладзіміра Манамаха?" — І прывёў цікавы разлік: — Вось глядзі, — пачаў пісаць ён лічбы. — У цябе чатыры бабулі і дзядулі. У кожнага з іх двое бацькоў — гэта восем тваіх прадзедаў. Кожны крок у глыбіню радавода падвойвае два прапрапрадзеды. Нават калі мы возьмем за адзінку часу, што аддзяляе адно пакаленне ад другога, трыццаць гадоў, хаця яна і большая, то ад часоў Манамаха змянілася на Русі, а пазней у Расіі, у склад якой уваходзіла Беларусь, дзвесце сорак пакаленняў.

І тут мой тата ўзяўся ўжо за калькулятар.

— Падвойваючы кожныя трыццаць гадоў колькасць тваіх продкаў, атрымаем велізарную лічбу — трыльёны чалавек. — Тата зацікаўлена зазірнуў мне ў вочы з надзеяй, што я нешта з гэтага зразумела, і закончыў сваю ўжо вышэйшую матэматыку. — Менавіта столькі павінна было б жыць у часы Манамаха тваіх прапра...дзедаў, калі б ніводзін з іх не ажаніўся з нейкім сваім родзічам. Трыльёны чалавек... Як жа перамешваліся людзі на тэрыторыі толькі былой Русі, калі на ўсёй Зямлі сёння жывуць шэсць мільярдаў чалавек. Дык чаму ж не могуць быць у тваёй крыві гены князёў Ігара ці Манамаха?! Наш род увогуле — гэта не толькі насельніцтва вёсак, раёнаў, дзе нарадзіліся нашы бацькі, а ў рэшце рэшт — цэлая краіна...

Вось так разважаў мой бацька Віктар Гурэцкі. Родам ён з Барысаўшчыны, з вялікай вясковай сям'і. Яго бацька — мой дзед — з роду палякаў, што пераехалі з Польшчы ў часы, калі частка Беларусі была польскай тэрыторыяй. Мой дзядуля — франтавік Вялікай Айчыннай, удзельнік Кёнігсбергскай аперацыі, двойчы паранены, узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны першай ступені, двума баявымі медалямі.

Маці майго бацькі — бабуля Лідзія Гурэцкая (дзявочае прозвішча Валкавец) — з роду сялян вёскі Навасёлкі Барысаўскага раёна. Бабуля Лідзія нарадзіла і разам з мужам выгадавала сямёра дзяцей.

Захаваліся звесткі пра яе дзеда Антона Валкаўца — удзельніка руска-турэцкай вайны, кавалера трох Георгіеўскіх крыжоў. Расказваюць, пасля той вайны кожны год на Юр'еў дзень яго ў ліку іншых герояў запрашалі ў Мінск на ўрачыстае і багатае частаванне. Памёр ён ва ўзросце ста двух гадоў.

Мая мама Тамара Гурэцкая з Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Род працавіты і паважаны ў вёсцы.

Яе бацька — дзядуля Мікалай Грынцэвіч у час Вялікай Айчыннай вайны пятнаццацігадовым юнаком у ліку іншых аднавяскоўцаў быў узяты немцамі на работы ў канцлагер. Цудам застаўся жывы: пасля вызвалення Савецкай Арміяй з дзесяткаў дамоў вярнуліся толькі тры чалавекі. Пасля службы ў арміі дзядуля закончыў курсы механізатараў і стаў працаваць на машынна-трактарнай станцыі, затым — лесніком у калгасе, а потым — зноў трактарыстам.

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

Матуля маёй мамы — бабуля Валя Грынцэвіч — таксама сялянка, усё жыццё працавала ў калгасе паляводам, жывёлаводам. Бабуля Валя — удалая майстрыха: умее ткаць прыгожыя рознакаляровыя посцілкі, абрусы, вышываць, шыць адзенне. Калі была маладая, то ў яе з задавальненнем шылі сукенкі не толькі аднавяскоўцы, але і больш далёкія модніцы.

Цікавіць і ўражвае, што ў маіх жылах цячэ па пунцовай "кроплі" продкаў розных пакаленняў. І хацелася б ведаць, хто яны былі, напрыклад, у XV стагоддзі? Як іх звалі, як яны выглядалі?

Шкада, што ў той час ніхто не вынайшаў відэакамеры...

Вольга ГУРЭЦКАЯ.

сямейныя абрады

ПРОВАДЫ Ў АРМІЮ

Белая бяроза
У полі стаяла.
А маці сыночка
На службу спраўляла.
На службу спраўляла,
Наказ аддавала:
— Служы, сыну, верна
Сваёй ты радзіме.
Служы, сыну, верна
Свайму ты народу,
Каб быў за цябе гонар
Усяму твайму роду...

Абрад провадаў навабранца ў войска мае больш позняе паходжанне ў параўнанні з іншымі сямейнымі абрадамі. На Беларусі ён узнік на межах XVIII–XIX стагоддзяў, пасля таго, як землі Вялікага княства Літоўскага далучылі да Расіі, дзе існавала "рэкруцкая павіннасць".

Як вядома, першы рэкруцкі набор на Беларусі праводзіўся ў 1794 годзе. У той час на службу ў войска забіралі на 25 гадоў. Узрост навабранца не абмяжоўваўся, і ад тысячы душ прызывалі 5–7 чалавек. У 1874 годзе была ўведзена агульная вайсковая павіннасць.

Абрад провадаў у войска нескладаны і паўсюдна амаль аднолькавы. Пасля таго, як прызыўнік атрымліваў павестку, ён ехаў з родзічамі ў царкву. Будучы ваяр закупліваў некалькі свечак і ставіў іх перад абразом святога, які лічыўся яго абаронцам. За здароўе прызыўніка маліліся Богу, служылі абедню.

Пасля, у наступныя два дні, ён наведваў блізкіх і сяброў. У час такіх абходаў бывалыя людзі давалі яму добрыя парады. За дзень да адпраўлення бацькі рабілі вечар провадаў – рытуальнае застолле. На Магілёўшчыне навабранца садзілі пад абразамі. Побач з ім сядалі бацька, маці, хросныя бацькі, бабка-пупарэзніца, дзядзькі, цёткі і іншыя сваякі. З другога боку садзілася моладзь.

Бацькі абвязвалі прызыўніка ручніком, вешалі крыжык на шыю. Усе маліліся, каб Бог вярнуў яго на сваю зямлю. Калі ў хлопца была нявеста, яна абавязкова дарыла хусцінку, якую сама вышыла. Госці частаваліся і спявалі песні. Да гэтага часу спяваюць "Апошні нонешні дзянёчак", "У нядзелю рана", "Ой, у лузе, пры даліне", "Праходзіць лета".

У дзень ад'езду на зборны пункт, а ў наш час у ваенкамат, бацькі благаслаўлялі сваё дзіця. На стол клалі каравай, запальвалі свечку. Маці здымала з кута абраз і давала прызыўніку тройчы пацалаваць.

У вёсцы Аляксандраўка Старадарожскага раёна як толькі хлопец збіраўся выйсці з хаты, яму давалі тройчы ўкусіць хлеба "на лёгкую долю". Пасля таго, як ён зачыняў за сабой дзверы, ля печы ў хаце пераварочвалі дагары вілкі, ёмку, качаргу. Усё было скіравана на тое, каб салдат вярнуўся дадому.

У абраду провадаў існавалі свае прымаўкі:

"Гуляй, хлапец,
будзе і табе лавец".
"Ваяка ваюе, а жонка
дома гаруе".
"Салдацкі сон
усюды салодкі".
"Не смейся, брат:
будзеш сам салдат".

У нашы дні абрад провадаў значна спрасціўся, але яго ідэйная накіраванасць і мэты асобных рытуалаў не страцілі сваёй значнасці ў народным жыцці.

Гаравала, гаравала
Над сыночкам маці:
А прыйшлося выпраўляці
Сына у салдаты.
Заіграліі музыканты,
Б'юць у барабаны.
Пытаецца маці ў сына:
— Калі прыйдзеш у госці?
— Калі вырасце травіца
На нашым пагосце.

Падрыхтаваў **Мікола КОТАЎ.**

навіны з архіва

ТАЯМНІЦА "Л.Д." РАЗГАДАНАЯ

Апошнім часам Дзяржаўны музей гісторыі і культуры Беларусі, што на вуліцы Карла Маркса ў Мінску, арганізаваў шэраг удалых выстаў, скіраваных на далучэнне сучаснікаў да багатай нацыянальнай духоўнай спадчыны. Днямі тут адбыўся вернісаж выдатнага беларускага фотамастака пачатку XX стагоддзя Льва Дашкевіча.

Леў Дашкевіч (1882–1957) — карэнны мінчанін, адзін з першых прафесійных фатографаў Беларусі, чый творчы росквіт прыйшоўся на пачатак дваццатых гадоў. Ён быў сябрам Янкі Купалы, аўтарам шэрага вядомых фотапартрэтаў беларускага песняра. Пакінуў Леў Дашкевіч і выдатную галерэю работ, выкананых у 1923 годзе ў краязнаўчай экспедыцыі ў Шацкай воласці Ігуменскага павета (Лявонавічы, Кавалевічы, Хатляны, Шацк), вызначыўся ён і як перакладчык. У вялікай музейнай зале сабраны творы майстра і тагачасная тэхніка для здымак.

Трэба адзначыць, што вяртанне гэтага імя нашчадкам адбылося дзякуючы супрацоўніцы музея Надзеі Саўчанка. Яе зацікаўленасць загадкавай манаграмай "Л.Д.", што змяшчалася на адваротным баку некаторых старых фотаздымкаў, прывяла не толькі да разгадкі, а і да арганізацыі выставы. Імя Льва Дашкевіча заняло пачэснае месца сярод тых, хто ствараў духоўныя каштоўнасці беларусаў на пачатку XX стагоддзя.

На вернісажы выступілі загадчык музея П.Хацько, вядучы навуковы супрацоўнік музея Янкі Купалы Ф.Ваданосава, энцыклапедыст і вучоны-гісторык В.Скалабан і іншыя.

Выстава будзе працаваць працяглы час.

Віктар ХУРСІК.

вернісаж

ВЫКАЗАЦЬ СВАЮ ПАШАНУ...

У бібліятэцы імя Л.Талстога ў Мінску адкрылася мастацкая выстава, прысвечаная 120-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа. Яе арганізатары нібы падкрэслілі, што год Купалы і Коласа яшчэ не скончыўся і не ўсе выказалі ім сваю пашану.

Удзельнікі выставы — мастакі, якіх натхняла творчасць Купалы і Коласа на працягу амаль усяго жыцця. Гэта народны мастак Беларусі Арлен Кашкурэвіч і не менш вядомыя Мікола Купава, Віктар Сташчанюк, Уладзімір Сулкоўскі і Янка Раманоўскі. Значная частка твораў, паказаных на выставе, добра знаёмая і аматарам паэзіі, і прыхільнікам выяўленчага мастацтва. Справа ў тым, што яны ў свой час знайшлі сваё месца ў мастацкім афармленні і ілюстраванні шматлікіх выданняў твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Дарэчы, з імі можна было пазнаёміцца на кніжнай выставе, якую падрыхтавалі супрацоўнікі бібліятэкі.

Трэба адзначыць: выставы, якія арганізуюць у бібліятэцы яе супрацоўнікі, заўсёды выклікаюць вялікую цікавасць у чытачоў, асноўная частка якіх — моладзь. Не была выключэннем і згаданая. На вернісаж прыйшло шмат студэнтаў, навучэнцаў школ. Для іх гэта магчымасць глыбей пазнаць творчасць нашых вялікіх класікаў.

НА ЗДЫМКАХ: у час адкрыцця выставы ўражаннямі дзеліцца госць з Варшавы Аляксандр ПРУШЫНСКІ; "Князь" — адна з ілюстрацый Арлена КАШКУРЭВІЧА да паэмы "Курган" Янкі Купалы; "Вязынка" — праца мастака Міколы КУПАВЫ.

Тэкст і фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

музейная зала

ЗНАХОДКІ ЭТНОГРАФАЎ

Экспедыцыя супрацоўнікаў Музея мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ў беларускай глыбінцы адшукала цікавыя знаходкі – прадметы побыту.

Гэта камень для жорнаў дыяметрам каля метра, хітрыя пасткі для рыбы, трохвугольныя грэбні для часання льну, вышытыя ручнікі і посцілкі, саматканыя пакрывалы і палотны... Адны з іх папоўнілі экспазіцыю музея, над іншымі "чаруюць" вучоныя-этнографы. Сёння яны шукаюць ключ да расшыфроўкі старажытнага язычніцкага арнаменту, вышытага на льняной начной кашулі.

"Мінск—Навіны".

зваротная сувязь

АРГЕНЦІНА

У БУЭНАС-АЙРЭСЕ ЎШАНОЎВАЮЦЬ ЯНКУ КУПАЛУ І ЯКУБА КОЛАСА

У рамках святкавання 120-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа ў Аргенціне праведзены шэраг мерапрыемстваў па папулярызацыі творчасці класікаў беларускай літаратуры.

Цэнтральнай падзеяй святкавання гадавіны вялікіх беларускіх майстроў пяра стаў урачысты вечар-фестываль, арганізаваны пасольствам у адным з найбуйнейшых культурных цэнтраў Буэнас-Айрэса пры ўдзеле шэрага прафесійных і самадзейных вакальных і танцавальных калектываў Федэральнай сталіцы Аргенціны і правінцыі Буэнас-Айрэс, прадстаўнікоў навуковай і культурнай грамадскасці Аргенціны, а таксама супрацоўнікаў шэрага пасольстваў.

Адкрыў урачысты вечар Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Аргенціне Вадзім Лазерка. З асобай цеплынёй гледачы сустрэлі твор Якуба Коласа "Месяц", які прагучаў у музычнай апрацоўцы Сільвіі Сабчук, папулярнай аргенцінскай спявачкі і гітарысткі з беларускімі каранямі. Вершы "А хто там ідзе?", "Мужык", "Вясна", "Касцу" ў выкананні беларускіх, рускіх і літоўскіх дыпламатаў, аргенцінскіх дзеячаў навукі і культуры прагучалі на васьмі мовах свету. Асобую атмасферу прыўнеслі выступленні харавых калектываў "Купалінка" і "Чайка". Своеасаблівым мастком паміж самабытнымі культурамі Беларусі і Аргенціны стала выступленне Нацыянальнага фальклорнага балета Аргенціны "Крыольё", вядомага беларускаму гледачу па гастролях у Мінску ў сакавіку 2002 года. Іскрамётныя "Лявоніха", "Юрачка", "Добры вечар" у выкананні самадзейнага танцавальнага калектыву беларускага клуба "Усход" (г.Берысо, правінцыя Буэнас-Айрэс), а таксама маляўнічыя беларускія нацыянальныя ўборы танцораў сталі яшчэ адным упрыгажэннем святочнага вечара.

У рамках фестывалю была разгорнута экспазіцыя мастацкіх плакатаў, прысвечаных жыццю і творчасці Янкі Купалы. Асобае месца на выставе было адведзена маляўнічаму выданню Янкі Купалы, якое выйшла на беларускай, рускай, украінскай, польскай, іспанскай, французскай, англійскай і нямецкай мовах.

Галіна ВІР.

дабрачыннасць

СЛОВЫ ПАДЗЯКІ ІРЫНЕ СМІРНОВАЙ-КАЛЯДЗЕ

Паважаная зямлячка Ірына! Са словамі ўдзячнасці звяртаецца да Вас Тамара Збароўская.

Мой сын у гэтым годзе адпачываў у Славеніі. Дасылаю гэты ліст з надзеяй, што яго надрукуюць. Сёння рэдка калі знойдзеш спачуванне, а Ірына Смірнова-Каляда разумее наша гора, думае пра будучыню Радзімы, духоўнае і фізічнае аздараўленне нашых дзяцей.

Мая сям'я не можа аплаціць такі адпачынак: муж — інвалід ЧАЭС, я часта хварэю. Н.Віхор, якая фарміравала групу, брала дзяцей толькі з няпоўных ці бедных сем'яў.

Надоўга застануцца ў памяці краявіды Славеніі, успаміны пра новых сяброў. Дзеці прыехалі адтуль не толькі фізічна здаровыя, але бадзёрыя, спакойныя душой, поўныя ўпэўненасці ў дабраце людской, веры ў жыццё, у дзень наступны. А гэта значыць — у будучыню.

Дзякуй Вам за дабрыню і спачуванне! Барані Вас Божа ад усіх напасцей. Удачы, цярплівасці, поспехаў і здароўя!

З павагай
сям'я ЗБАРОЎСКІХ з Мазыра.

беларусы ў свеце

СВІТАНАК ВА УЗБЕКІСТАНЕ

Расказваючы пра работу БКЦ і пералічваючы праведзеныя мерапрыемствы, заўсёды памятаю, што за кожным з іх стаіць праца добрых і бескарыслівых людзей, якія імкнуцца да духоўнага яднання і гарманізацыі культуры міжнацыянальных зносін. Як правіла, кожнае старанна і добра праведзенае мерапрыемства пакідае глыбокі след у душах прысутных, абуджаючы ў сэрцах дабро і святло. Сапраўдным летапісцам БКЦ з'яўляецца яго мастацкі кіраўнік Валянціна Цітова, менавіта яна адлюстроўвае жыццё цэнтра ў шматлікіх публікацыях (іх каля 40) у беларускіх і ўзбекскіх сродках масавай інфармацыі. Таленавіта напісаныя, яны ажыўляюць сухія факты і даюць магчымасць убачыць за імі людзей з іх добрымі пачуццямі.

У газеце "Вечерний Ташкент" (9.09.1996) у рубрыцы "У нацыянальных культурных цэнтрах" з'явілася яе публікацыя пад назвай "Вечар пры свечках". Гэта аповед пра вечарыну, прысвечаную 90-годдзю з дня першай публікацыі вершаў Якуба Коласа. На сустрэчы з дакладам пра Якуба Коласа выступіў А.Ліхадзіеўскі. Ён расказаў пра гады жыцця паэта, пра тое, што адна з вуліц Ташкента названа імем Якуба Коласа. І гэта не выпадкова: вядомы беларускі паэт у гады вайны з 1941 па 1943 год жыў у Ташкенце. Якуб Колас сябраваў з узбекскімі паэтамі — Хамідам Алімджанам, Гафурам Гулямам. Яго творчасць, прасякнутая ідэямі свабоды, незалежнасці свайго народа, і сёння прымушае задумацца пра нашы нязменныя каштоўнасці.

А потым пры свечках са сцэны ўзнёсла гучалі вершы Якуба Коласа ў выкананні актывіста цэнтра Ангеліны Пратасевіч. Вольга Нугаева сваім глыбокім пранікнёным голасам спявала песні на вершы беларускага паэта, а мастацкі кіраўнік цэнтра Валянціна Цітова чытала ўласную паэму "Пра бацьку Якуба", прысвечаную свайму любімаму паэту. І гучалі ўсхвалявана радкі:

"Почему называешься
Белою Русью?
Не от роц ли березовых
иль облаков?
Есть мой корень в земле твоей,
тем и горжусь я.
Где сейчас белых аистов клин?
Далеко...

...В моем сердце живешь ты,
родная сторонка,
Наяву не встречаемся,
только во сне.
Вижу: с радостью
с горки сбегает девчонка,
Чтоб напиться воды
ключевой по весне.

Ублажаю себя белорусскою
мовой,
Когда слушаю в песнях
ее и в речах.
И пусть жизнь
обернулась судьбою суровой,
Попрошу, чтоб до срока не гасла
свеча".

Такіх публікацый, яркіх і цікавых, якія асвятляюць дзейнасць БКЦ "Світанак", у В.Цітовай шмат. Яны змешчаны на старонках газет "Народное слово", "Вечерний Ташкент", "Ташкентская правда", "Бирлик", "Голас Радзімы" (Беларусь) і іншых. Але Валянціна Мікалаеўна не абмяжоўвае сябе толькі публіцыстычнай дзейнасцю. Ёю распрацавана цікавая аўтарская праграма "Культура без граніц", асноўная задума якой — праводзіць аўтарскія сустрэчы і канцэрты з выкарыстаннем традыцыйных народных форм. Яна садзейнічае ўзаемаабагачэнню нацыянальных культур і скарыстанню элементаў традыцыйных народных свят для больш поўнага насычэння новых свят Узбекістана: Дня абаронцаў Радзімы, Дня памяці і ўшанавання, Дня незалежнасці, Дня настаўніка, Дня Канстытуцыі... Першапачатковы праект праграмы прадугледжвае рэалізацыю яе ў Каракалпакстане і ў абласцях Узбекістана.

Вялікае значэнне ў дзейнасці БКЦ "Світанак" надаецца дабрачыннасці, дапамозе адзінокім хворым састарэлым людзям. Так, па хадайніцтве БКЦ у Рэспубліканскі пансіянат ветэранаў вайны і працы накіравана ў снежні 1996 года Зоя Чарнабаева, беларуска, 1919 года нараджэння. У вучэбна-метадычным цэнтры Міждзяржаўнай акадэміі сферы быту і паслуг вучыцца на завочным аддзяленні на льготных умовах актывістка БКЦ Алена Рэдзіна. Па хадайніцтве БКЦ у ВНУ Рэспублікі Беларусь накіроўваюцца абітурыенты, якім аказваецца дапамога ў набыцці авія- і чыгуначных білетаў (Аляксей Алесіч, Андрэй Жураў, Алеся Торап). Маральная (на жаль, не матэрыяльная) падтрымка аказваецца БКЦ жанчынам-пенсіянеркам, інвалідам, былым вязням (Н.Сцябловай, З.Ліннік, Н.Шчаголавай і іншым). Фінансавую спонсарскую дапамогу БКЦ да 1997 года аказвалі Узбекска-Беларускае СП "Узбекмашсервіс", прадпрыемства "Элком", СП "Узбелст", МП "Вераніка".

У рабоце БКЦ "Світанак" дапамагае Рэспубліканскі інтэрнацыянальны культурны цэнтр. І асобую падтрымку цэнтр адчуў ад Пасольства Рэспублікі Беларусь ва Узбекістане, у прыватнасці, ад Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Мікалая Дземчука і супрацоўніцы пасольства Святланы Шумскай. Яны праяўляюць пастаянную ўвагу да ветэранаў вайны, аказваюць метадычную дапамогу актывістам БКЦ "Світанак" і асабіста ўдзельнічаюць у мерапрыемствах. Пасольства спрабуе забяспечыць перыядычнай беларускай літаратурай і фотаэкспазіцыямі. Напрыклад, летась на святкаванні 8-й гадавіны з дня стварэння БКЦ была разгорнута фотавыстава "Прасторы маёй Радзімы". А ў час святкавання 120-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа ў Нацыянальнай бібліятэцы ўдзельнікі вечарыны мелі магчымасць пазнаёміцца з літаратурна-мастацкай экспазіцыяй, якая расказвае пра жыццёвы і творчы шлях вядомых беларусаў: дакументальныя матэрыялы — сямейныя фотаздымкі, фотакопіі аўтографаў, буклеты. 10 ліпеня 2001 года ў грамадска-палітычнай газеце "Fidokor" было апублікавана інтэрв'ю першага сакратара пасольства Беларусі С.Шумскай "Вецер дружбы" карэспандэнту "Туркестон прэс", у якім, гаворачы пра дзейнасць БКЦ "Світанак", яна выказала ўдзячнасць інтэрнацыянальнаму культурнаму цэнтру за дапамогу беларускай дыяспары.

Падводзячы вынікі сказанаму, хочацца адзначыць, што асноўная частка вызначаных статутам БКЦ задач вырашаецца ў паўсядзённай дзейнасці цэнтра. Гэта разнастайная культурна-асветніцкая работа і дабрачынная дзейнасць. На жаль, пакуль яшчэ БКЦ не змог вырашыць задачу, сфармуляваную ў статуце, па садзейнічанні ў развіцці эканамічных, культурных, навуковых сувязей, супрацоўніцтве ў сферах экалогіі, аховы здроўя. Думаецца, гэта стане прадметам разгляду і рашэння з боку кіраўніцтва цэнтра ў бліжэйшы час. Але з усіх праблем перспектыўнай работы БКЦ гэты накірунак займае асобае месца. Будучыня цэнтра залежыць ад таго, хто прыйдзе на змену выдатным людзям і нястомным актывістам. Іншымі словамі, першачарговая задача — работа з маладым пакаленнем. Рэалізацыя маладзёжных праграм дае надзею, што новае пакаленне беларускай дыяспары зможа ўключыцца ў працэс самарэалізацыі і ўмацавання самабытнасці беларусаў, што служыць умовай выканання на практыцы закладзеных у Канстытуцыі Рэспублікі Узбекістан норм свабоднага развіцця грамадзян любой нацыянальнасці ў гарманізацыі міжнацыянальных адносін і пабудове дэмакратычнага грамадства ў Рэспубліцы Узбекістан.

Нэла МАНДРАЛЬСКАЯ,
кандыдат гістарычных навук.

Заканчэнне. Пачатак у № 43.

спадчына

КЛОПАТ АЛЕСЯ ЦЫРКУНОВА

Пра тое, што мастак Алесь Цыркуноў працуе над помнікам удзельніку паўстання 1863-1864 гадоў Фларыяну Даноўскаму (1825-1902), на старонках "Голасу Радзімы" паведамлялася. Задума годна ўшанаваць памяць мужнага змагара ўзнікла некалькі гадоў таму, калі было адшукана месца яго апошняга спачыну на могілках вёскі Каралінава, што ў Пастаўскім раёне.

Але ад задумы да здзяйснення шлях няпросты. Асабліва ў даным выпадку. Бо гэта была прыватная ініцыятыва, і Алесь Цыркуноў мусіў усё ажыццяўляць, што называецца, на голым энтузіязме. Ды наўрад ці быў бы плённым вынік, каб не адгукаліся роднасныя душы, якія бескарысліва дапамагалі ў працы, набыцці матэрыялаў. Была і яшчэ адна, не менш важная праблема: адсутнасць у мастака вопыту. Сапраўды, можна было засумняваццa, ці здолее ён стварыць скульптурную выяву Фларыяна Даноўскага паводле афорта слыннага мастака Альфрэда Ромера, сядзіба якога знаходзілася непадалёку ад Каралінава. Але цяжкасці ўрэшце пераадолены, і ў апошнія летнія выхадныя адбылося адкрыццё помніка, які ўяўляе сабой досыць складаную кампазіцыю. На ўрачыстасці былі госці з Мінска, але аснову складалі тутэйшыя жыхары з памежных Мядзельскага і Пастаўскага раёнаў. Пераважала моладзь, былі людзі і старэйшага ўзросту, сярод якіх вылучаўся дзядок, грудзі якога абвешаны баявымі ўзнагародамі. Помнік асвяціў і справіў імшу мясцовы каталіцкі святар. З цікавасцю выслухалі прысутныя выступленне Алеся Цыркунова. Ён пранікнёна расказаў пра жыццё (гераічнае, самаахвярнае, нязломнае) Фларыяна Даноўскага, выказаў шчырае слова падзякі ўсім, хто матэрыяльна і маральна дапамагаў яму ў працы над помнікам, як, напрыклад, Юрась Фурс з Паставаў, які, апрача іншага, зрабіў цікавую кавальскую аздобу.

Быў асвячоны таксама ўзведзены стараннем А.Цыркунова помнік Вандзе Ромер. Яна належыць да славутага мастакоўскага роду, пра які на Беларусі вядома недаравальна мала. Алесь па заканчэнні ўрачыстасці запрасіў усіх наведаць колішнюю сядзібу Ромераў, якая знаходзіцца ў занядбаным, проста аварыйным стане і патрабуе тэрміновай рэстаўрацыі. На цяперашні час гэта чарговы грамадзянскі клопат Алеся Цыркунова, ды ён добра ўсведамляе: без удзелу дзяржавы, а больш дакладна — Міністэрства культуры тут не абысціся. Хочацца спадзявацца, што высечаныя на помніку словы з верша Янкі Купалы "Зваяваным" "...Сьпіце! Мы вашых навек не забудзем магілаў; Збуджаны вамі, мы ўскрэсьлі, мы больш не засьнём!" — стануць запаветнымі ў вяртанні з забыцця і ўшанаванні тых, хто гэтага заслужыў сваім ахвярным жыццём.

НА ЗДЫМКУ: на адкрыцці помніка, Алесь ЦЫРКУНОЎ (чацвёрты злева).

Яўген ЛЕЦКА.

літаратурная старонка

Янка БРЫЛЬ

ЛЕТАШНЯЕ

З ЛІРЫЧНЫХ ЗАПІСАЎ

Прачнуўся з пачаткам верша "И скучно, и грустно...", паступова аднавіўшы яго ў памяці, нават і паўтарыў увесь уголас яшчэ ў пасцелі.

Лермантавым я зачытваўся, можна сказаць, змалку, аднак не памятаю якога-небудзь ранняга ўражання, зробленага іменна гэтым вершам. Яго для мяне нібы і не было да старога талстоўскага томіка філасофскіх "статей", з якіх асабліва выразна запомнілася адна з проста-выразнай назвай "О жизни". Нават нязграбная друкарская памылка помніцца ў радку "Любить... но кого же?..": замест "кого же" — "како же"...

Сосны на маласельскіх могілках, пад якімі я апынуўся, коней пакінуўшы з плугам у баразне. Страх смерці, хуткаплыннасць і недарэчнасць жыцця мне, дзецюку на семнаццатым годзе, адчуліся... так і хочацца сказаць: глыбока. "Такая пустая и глупая шутка..." Рэдка калі пасля думалася таксама балюча ды безвыходна.

Сёння ж падумаў і так: тут, далёка ад сваёй бібліятэкі, не магу праверыць, у якім узросце Ён пісаў гэта. Калі ж і пад самы канец жыцця, дык усё ж маладым чалавекам, і колькі б у яго ні было глыбінных прычын для такога трагічнага расчаравання ў разумным сэнсе чалавечага лёсу, у яго не было і такой расцягнутасці існавання, як у мяне, такога нагрувашчання памылак, такое стомы ад перажытага, такое натуральнай блізкасці да заканчэння...

* * *

Два тоўстыя тамы Зігфрыда Ленца, збор апавяданняў з цяжкаватай па-даўняму назвай "Эйнштейн пересекает Эльбу близ Гамбурга" і раман "Краеведческий музей". Не помніцца, што я мог чытаць у гэтага заходняга немца, ва ўсякім разе не "Урок немецкого", ды вось яно — адкрыццё, па словах Нэру, яшчэ аднаго "вартага прачытання" — гэта бясспрэчна. Пачаў з апавяданняў. А ўчора па поўдні, застаўшыся тут, на дачы, адзін, прысеў на ганку насупраць ласкавага сонца над блізкім лесам і перайшоў на другую "цагліну", раман.

Бывала, дый неаднойчы, такое цягучае, прыкрае адчуванне, што я чытаю зашмат, як ваду ў пясок льючы, амаль услед забываючы прачытанае. А цяпер, і ўчора, і сёння зноў радасць сур'ёзнага чытання, законная доля работы жыцця, славутае "общение с душами прежде живших людей", хоць у гэтым выпадку не "прежде живший", а нават даволі значна маладзейшы за мяне сучаснік.

І ў адзіноце няма адчування яе — адзіноты.

* * *

Няшчасце яднае людзей, абуджае ў душах тыя пачуцці і думкі, якія даюць надзею на святлейшую будучыню чалавецтва. Так цяпер, пасля адзінаццатага верасня, з Амерыкай.

Праўда, ёй намякаюць пра Хірасіму, пра Бялград і яшчэ пра што, і ёй, яе кіраўніцтву варта было б задумацца над тым, што пекла вайны яна ў сябе дома не перажывала, а лёсам другіх народаў хоча і практыкуецца распараджацца па праву сілы і заможнасці. Вось і цяпер, калі ёй шматлюдна, шчыра спачуваюць, яна зноў пагражае, спадзяецца на сваё золата і жалеза, не ўлічваючы найдаражэйшага — крыві нявіннага маленства, святога мацярынства, мірнай мужчынскай сталасці, безабароннай старэчы — новых тысяч, мільёнаў ахвяр... Ужо не іхніх, зноў "варожых"!..

Страшна, няўтульна на нашым свеце!.. І не па Гогалю — "господа", па-народнаму, па-чалавечы: людзі добрыя, дарагія сябры!..

* * *

Востра адчулася, што маё, у той ці ў іншай меры аўтабіяграфічнае, перш за ўсё «Птушкі і гнёзды», трэба было напісаць з усёй безагляднай, бязлітаснай шчырасцю, што я зрабіў не на ўсю моц, а з той асцярожнасцю, аглядкай, з тым страхам, які абумоўліваў і мой сацрэалізм...

Літаратарам-прафесіяналам я стаў дзякуючы ўваходу ў савецкую рэчаіснасць, то па наіўнай шчырасці, то з патрыятычнага абавязку вучачыся стаць, быць савецкім пісьменнікам, бо інакшым быць і не мог. Калі б вайна, аб'яднанне Беларусі адбыліся гадоў на дзесяць пазней, я, жывучы ў Заходняй, застаючыся селянінам, можа, і змог бы стаць, як літаратар-саматужнік, у пэўнай меры значным ці прыметным сваёй шчырасцю, праўдай жыцця, аднак — гэта ж толькі *калі б*...

* * *

У "Літгазеце" прачытаў нядаўна вершы Якава Хелемскага, у адным месцы цёпла засмяяўшыся ад канцоўкі верша, які пачынаецца такім знаёмым і мне настроем:

Надоела безнадёга,
Поспеши расстаться с ней,
Жить осталось так немного,
Не губи закатных дней.

Можна было б працытаваць і дванаццаць наступных радкоў, але бяру канцоўку:

Побеседуй с музой пылко,
Белый лист в машинку вдень
И, воскликнув: — Жив, курилка! —
Оправдай дарёный день.

Крыху залёгка, можа, і з пэўнай бравадай, але ж і весела, услед за народнай мудрасцю.

І трэба ж! — тое чытанне аказалася нейкім уступам, нейкім прадбачаннем у мяне — ад Яшы прыйшла бандэроль, зборнік вершаў "Високосный год" з сяброўскім, верыцца, шчырым аўтографам. Учора, пасля дажджлівай хмарнасці захад рэзкавата распагодзіўся, і я закончыў дзень чытаннем таленавітай паэзіі даўняга і актыўнага сябра беларускага слова.

* * *

У Салжаніцына ("Бодался теленок с дубом") спадабалася:

"Что-то скажется прямо о Боге, заплеванном семечками атеистов".

І яшчэ, пра аўтабіяграфічнасць:

"За всей жизнью пером не поспешь".

А ў Лужаніна пра адзіноту (і назва верша такая):

Напішаш ліст, вазон пальеш,
Глядзіш і дзень правёў, —
Кароткі дзень старэчых спраў.

* * *

У нашым Загоры ў маім маленстве лапці насілі сырамятныя, нават у каго і аборы былі не вераўчаныя, а з мякчэйшай скуркі. Толькі ў дзеда Коціка яшчэ ўсё паласяныя, з лыка. У прадвясняным разводдзі раўчуком каля платоў з вышэйшага канца вёскі ў наш ніжэйшы канец калі-нікалі даплываў, натоўкшыся ў берагі, такі нямодны паласяннік, і нам, падшыванцам, пацешна было пароць якімі-небудзь патарчакамі той "карабель" без абораў, знятых старым Коцікам для наступнага, каб яшчэ раз не віць.

Таксама ж успамін. Прыйшоў ён, пакуль я сядзеў пры не зусім астылай за ноч бела-кахлянай грубцы, ціха чакаючы прыезду ўнучкі з мужам. На машыне, вядома, што сёння не толькі ў горадзе, але і ў вёсцы не навіна.

Прагрэс!..

А днямі старая паштарка гаварыла мне, што ў школу з іх недалёкага Беражна ў Мір, за пятнаццаць кіламетраў, спецыяльны аўтобус бярэ ўжо толькі двое дзяцей — з двух з нечым соцень хат...

* * *

Цёўканне аерам, як на губным гармоніку, — дзіцячае, найбольш хлапчуковае свята ў суботу перад Сёмухай, калі з лесу прывозіліся для ўпрыгожання двара бярозкі, а з-над рэчкі аер, нарэзаўшы якога, пасыпалі свежавымытую падлогу ў хаце.

У нашага бацькі ад любасці да дзяцей і ў самога былі дзіцячыя рысы ў характары. Так ён, ужо і хвараваты, і вечна ў рабоце, у сваё апошняе лета ездзіў на нашым сівым сібірачку на Вушу, за два кіламетры, і ў лес за ракою, яшчэ больш за тры, каб прывезці радасць малым.

У татарскім квартальніку "Байрам" прачытаў пра ўласцівасці аеру, і вось павяло на запіс.

Там яшчэ цытуецца з кітайскага медыцынскага трактата: "У яго каранішчы смак пякучы, уздзеянне цёплае, сагравачае, моцна ўплывае на страўнік, мужчынам дае сілы на ноч і спакой днём".

А дзецям, — дадамо, — такое бела-ружова-зялёнае цёўканне.

* * *

Паўвекавы дубовы гай залішне густымі стваламі і непрадзымута сплеценымі кронамі з пажоўклай лістотай выходзіць да самага абрывістага берага ракі. Стаю пад лёгкім пошумам вяршыняў і гляджу на Нёман. На тым, ніжэйшым баку — разлогі выпасвены луг, засланы сонечным надвячэрнім спакоем. Дзве стромкія алешыны, збоку асветленыя сонцам, стаяць на голым, роўным беразе вялікай рагаткай з укапаным канцом-дзяржаннем, а можа, лепш лацінскай літарай V, мітынговым знакам вікторыі-перамогі, і хораша, нібы й незалежна ад сонца, выразна адлюстроўваюцца ў роўненькай, хуткай плыні. Уздоўж майго, крутога берага рэдкім накрапам плыве апалае лісце, і далей, за стрыжнем, чыстая вада свабодна раскашуецца сонечным бляскам, ажно нібыта моршчыцца ад асалоды, гуллівa пераплываючы цераз тое нерухомае адлюстраванне.

Так ідзе час.

А можа, і вечнасць...

* * *

Зімою, калі мы, загорцы, мужчыны і дзецюкі, санным абозам вярталіся з пушчы, седзячы на дрывах, у Вялікай, а лепш было б — у Доўгай Вобрыне, дзяўчаты-папрадухі, у нас называліся скудзельніцы, што пазбіраліся ў хатах гурточкамі, каб весялей было працаваць, пастуквалі нам, хлопцам, праз шыбы — па дзве, па тры ў акне — то чучкамі, то жучкамі, таўсцейшымі канцамі верацёнаў. Адна аж пагразіла мне кулачком — чаму не гляджу. Смеючыся. Адтуль гэта, з далё-далёкай маладосці.

* * *

Праз чырвоныя, жоўтыя і блакітныя, рознафарматныя шыбіны ды шыбінкі касцельнага вітража відно, як у сонцы варушацца лапы сасны, неад'емна дасканалячы красу.

* * *

Нёман пятляе, і ў яго разложыстых лукавінах, па-мясцоваму, нартах, дзе зрэдку высяцца спрадвечныя дубы, хораша бачыцца светла-зялёная, свежая стрыжка сенажаці.

* * *

Дзядзька Паўлюк, зайшоўшы ў хату, дзе суседзі абедаюць:

— Дзень добры, хлеб цёплы, капуста гарачая, натура сабачая!

І за такое на яго, старога байдуна, не абражаліся, — прывычка і гаварыць, і слухаць.

* * *

Сонца раптам ды нечакана выглянула з-паміж хмараў, і на суседавай яблыні запрышчыліся яблыкі, якіх бачыцца больш, чым лістоў.

* * *

Унучка на чацвёртым годзе:

— Гуляць мы, дзеду, пойдзем з табою, калі сонейка нагрэе ветрык.

* * *

У "Куфэрку Віленшчыны" — пра «кушлянскага рупліўца» Міхала Ляпеху, ахоўніка Багушэвічавай сядзібы. З гэтым "нізавым патрыётам" я калісьці выпадкова сустрэўся ў вестыбюлі Дома літаратара, нехта нас пазнаёміў, і сухарлявы, высокі дзядок на дзевятым дзесятку весела нагаварыў мне пра Пятра Барана, майго таварыша па войску і палоне, — як той, таксама дасціпны смаргонскі каваль, прыязна мяне ўспамінае...

Прыемна гэта, такія дакрананні душамі з цікавымі людзьмі.

* * *

У дыярыушы Пачобута-Адланіцкага, аднаго з "нашых" магнатаў у эпоху Вялікага княства Літоўскага, пра Бога гаворыцца і паўтараецца, што ён "Пан над Панамі", — і ў другім выпадку з вялікай літары, зусім феадальна.

* * *

Дакументальныя тэлефільмы, адзін за адным, пра двух жывых лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі.

Працаўнік Салжаніцын. Заслужаныя слава і дастатак, прысмак апальнасці і глыбокая старасць. Яна была асабліва выразна відаць, калі ён па просьбе нябачнага аператара праходжваўся па вузкай, доўгай верандзе на фоне недалёкага лесу, снежнага цаліку на зямлі і гульні сняжынак у паветры. Разоў некалькі няспешна праснаваў туды і назад, асцярожна пахіствaючыся, з кійком, барадою і шапкай, злёгку падобны да "яснополянского старца".

* * *

...А мне *адраджацца* не трэба, беларусам я *нарадзіўся* даўно, у раннім вясковым юнацтве. Няма і патрэбы хваліцца тым, што ад пачатку і назаўсёды тваё.

* * *

Светлая, мужная жанчына, знаёмая выкладчыца адной з нашых тэхнічных ВНУ, у тэлефоннай гутарцы, калі я спытаўся, як жа ёй працуецца, падаючы маладым вышэйшую матэматыку — па сваёй волі і настаянні — па-беларуску, з вясёлай... лепш — з радаснай шчырасцю расказала, як прыкметна апошнім часам расце ў студэнтаў *свабодная цяга* да роднай мовы.

Паводле публікацыі ў часопісе "Полымя" № 3-4 за 2002 год.

стасункі

ПА АБОДВА БАКІ АЎГУСТАЎСКАГА КАНАЛА

Праблемы аховы і гаспадарання на Аўгустаўскім канале цікавяць вучоных і спецыялістаў.

Аўгустаўскі канал, пабудаваны 160 гадоў таму, працягнуўся на сто адзін кіламетр і злучыў басейны Віслы і Нёмана. Васемнаццаць шлюзаў дазвалялі падымаць і апускаць судны з аднаго ўзроўню воднай паверхні на другі. На сёння польскі бок канала (каля 80 кіламетраў) поўнасцю функцыяніруе і выкарыстоўваецца для воднага, пешага і аўтамабільнага турызму, прымаючы штогод 25 тысяч аматараў прыроды і актыўнага адпачынку. Дваццаць два кіламетры беларускай часткі канала ўжо многія гады бяздзейнічаюць. Разам з тым аднаўленне гэтага адрэзка канала пад апекай ЮНЕСКА, стварэнне адпаведнай інфраструктуры прылеглай тэрыторыі можа стварыць умовы для развіцця міждзяржаўнага турызму ў гэтым рэгіёне.

НА ЗДЫМКАХ: спецыялісты знаёмяцца з работай шлюза; начальнік Галоўнага ўпраўлення архітэктуры Гродзенскага аблвыканкама Анатоль ПАРХУТА (справа) гутарыць з прафесарам Міхелем КАТЭ (Францыя).

Фота БЕЛТА.

слухай сваё

ПЕСНІ ПРА ТОЕ, ЯК ПАПСАВАЛІ ТАНЦЫ

Віктар Шалкевіч. "Добрай раніцы", Мн., 2002, "БМАgroup"

Сярод найбольш папулярных серыйных выданняў беларускіх музычных лэйблаў у першую чаргу трэба назваць навукова-гістарычны цыкл кампакт-дыскаў і касет "Беларускі музычны архіў", які выдаецца кампаніяй "БМАgroup" усяго толькі два гады, а ўжо ахоплівае і шырокі гістарычны спектр, і прыкметную жанравую разнастайнасць, і нават немалую геаграфічную прастору. Былі тут ужо зборы твораў вядомага беларускага спевака М.Забэйды-Суміцкага, які пэўны час працаваў у Міланскім тэатры "La Scala", кампазітара і дырыжора М.Равенскага, а таксама вандроўнага (то Наваполацк, то Нью-Йорк, то Мюнхен, то Прага) паэта з гітарай С.Сокалава-Воюша.

І вось — новы аўдыётомік серыі, які прысвечаны ўжо зусім іншаму жанру, вельмі рэдкаму ў Беларусі, жанру кабарэтнай песні.

А кабарэ — гэта і музыка, і тэатр, і паэзія, і гумар, і сатыра. Дык вось Віктар Шалкевіч за гады сваёй творчай кар'еры, каб увайсці ў такую унікальную стылістыку, паспеў неардынарна праявіць сябе ва ўсіх гэтых плынях паасобку: ён і славуты бард (прыгадайце яго альбомы "Балады і рамансы", "Правінцыя", "Смутны беларускі блюз"), і тэатральна-кіношны дзеяч (акцёр Гродзенскага тэатра лялек, суперзорка знакамітых відэафільмаў "Салодкі яд кахання", "Слёзы блуднага сына"). У новым рэлізе слухач знойдзе і старыя знаёмыя песні ("Стары Бальшак", "Кароткая гісторыя Беларусі"), і цалкам новыя творы, хіт-скачок якіх толькі наперадзе ("Зайчык", "Мы ехалі да Магілёва"). Па добрай старой традыцыі серыі яе зборы вельмі шчыльна нашпігаваны якасным матэрыялам — ажно да 80 хвілін.

Цікава, што ў папулярным супольным праекце "Святы вечар-2000", у якім В.Шалкевіч удзельнічаў побач з такімі суперзоркамі, як "N.R.M.", "Крыві", Аляксандр Памідораў, ужо была яго калядная песенька пад назвай "Святы Мікалай":

На поўначы краіны
Фінляндыі,
У далёкай халоднай
Лапландыі,
Жыве стары дзед Мікалай,
Добры сівабароды дзядуля...

Сустракаецца назва "Святы Мікалай" і ў трэкспісе новага выдання, але... Гэта ўжо зусім іншая песня, якая ў касетных выпусках альбомаў Віктара Шалкевіча мела і назву, істотна адрозную — "Балада пра святога Мікалая". Так што нават тут, дзе слухач натыкаецца на знаёмыя прыкметы, яго чакаюць неверагодныя адкрыцці.

Стары дасведчаны анёл —
Айца нябеснага пасол —
Штогод у наш дом з навінай
добрай прылятае...

А галоўная ж прывабная фішка спеваў Віктара Шалкевіча (то пад інтымныя акорды гітары, то ў шыкоўным антуражы вялікага аркестра, то з нечакана вострымі рок-аранжыроўкамі) — гэта трапная сатыра, тонкі гумар, нязгасны аптымізм у любой уяўна невырашальнай праблеме.

Нясумныя песні, багата ілюстраваны буклет (мастак Цімох Нявінскі, фота Уладзіміра Панады), грунтоўная навуковая падтрымка (бібліяграфія, дыскаграфія, аналіз творчай біяграфіі) робіць гэтае выданне жаданым экспанатам хатняй калекцыі кожнага свядомага беларуса.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА.

уражанні

Што і казаць, кожны з нас напрыканцы працоўнага тыдня, нагружаны клопатамі, праблемамі, пошукам шляхоў іх вырашэння, з нецярплівасцю чакае дні адпачынку, каб на некаторы час, забыўшы пра штодзённыя абавязкі, знайсці спосаб супакаення. Робяць гэта, безумоўна, па-рознаму.

Аднаго задаволіць мяккае крэсла каля тэлевізара, другі паедзе на дачу, каб скарыстаць апошнія восеньскія дзянькі, корпаючыся на градках. А каму ўсё гэта нецікава — той садзіцца ў аўто і кіруе ў лес, на рэчку ці возера, бо нішто не дае такога супакаення, як сустрэча з прыродай. А калі гэта яшчэ і заўзятыя рыбаловы, то праблема выбару месца адпачынку адпадае сама па сабе.

Менавіта да апошніх адносяцца мае сыны і значная частка іх сяброў. Іх не засмучае часам адмоўны вынік рыбалкі, бо галоўнае для іх — сам працэс. У гэтым я пераканаўся, далучаючыся часам да іх вандровак. А можа галоўнае ў той асалодзе, якую адчуваеш, назіраючы нараджэнне дня, калі першы прамень сонейка кранаецца макавак прыбярэжных дрэў, а твая лодка паволі рухаецца скрозь ранішні туман? Цішыню парушае толькі шоргат трыснягу і плёскат шчупака, які выйшаў на паляванне. Ды час ад часу прашамацяць крыламі ў небе качкі, ружовыя ад нябачнага яшчэ сонца. Увогуле, такія вандроўкі ў першую чаргу — знаёмства з новымі мясцінамі, іх непаўторнай прыгажосцю.

Часам іх і не плануеш загадзя, як гэта было ў адну з паездак з сынам Дзмітрыем па справах у Навагрудак. Дадому вырашылі вяртацца не звыклым шляхам праз Карэлічы і Мір, а зрабіць крук на Іўе, каб завітаць на месца сутокі Нёмана і Гаўі. Паблукаўшы па лясных дарогах, трапілі каля вёсачкі Альхоўка на высокі бераг Нёмана. Тут ён, прыняўшы ў сваё лона недзе ў зарасніках чароту Гаўю, робіць круты выгіб. З вышыні далёка відаць процілеглы, нізкі бераг, упрыгожаны каранастымі дубамі. Пакуль я займаўся фатаграфаваннем, сын, не губляючы часу, знік са спінінгам пад абрывам. А я выкарыстаў магчымасць спакойна назіраць павольную плынь магутнай ракі. Міжволі прыходзяць думкі пра яе спрадвечнасць.

Восеньскі дзень кароткі, і неўзабаве стала змяркацца. У прыцемках з'явіўся трохі стомлены паходам сын. Яго рыбацкае самалюбства задаволена: на кукане вісеў паважны шчупак.

Са шкадаваннем пакідалі мы бераг Нёмана. Бо вельмі кароткай была сустрэча з гэтым цудоўным куточкам Панямоння. Але ж супакойвала думка: мы заўсёды можам сюды вярнуцца.

НА ЗДЫМКАХ: Нёман каля вёскі Альхоўка Навагрудскага раёна; зайздросная здабыча.

Тэкст і фота Яўгена КАЗЮЛІ.

простыя ісціны

СВЯТЛО ДАБРЫНІ

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

Раскажу прытчу, якую ў свой час пачуў ад маёй бабулі Тацяны Карнялюк. Гэтая прытча — пра самае вечнае і гуманнае — дабрыню і маці. Бо маці — гэта ласкавае сонейка ўсіх хат сінявокай Беларусі.

...Аднойчы маці сказала свайму сыну:

— Я хацела б, каб ты, калі вырасцеш, быў дужым, як мядзведзь, хуткім, як алень, свабодным, як арол, мудрым, як змяя, і добрым, як ... Я таксама вельмі хацела б, каб ты быў добрым, — скончыла маці.

— Як хто? — спытаў сын.

Але маці ўсё ніяк не магла падабраць прыклад, таму сказала:

— Сапраўдную дабрыню ні з чым нельга параўнаць, дзіцятка маё.

— А я ведаю, мама. Дабрыня, як тваё сэрца. Калі ты дома — вакол нас пяшчотнае і ласкавае сонейка. І таму цесная хата становіцца вялікай і прасторнай...

Канстанцін КАРНЯЛЮК, педагог.

фестывалі

ПОЛЕ БІТВЫ СТАНЕ ПОЛЕМ СПЕВАЎ

Ужо адзінаццаты год запар на Крапівенскім полі пад Оршай праходзіць бардаўскі фестываль.

Упершыню гэта свята адбылося ў 1991 годзе. Арганізавалі яго барды Юрась Копцік, Андрэй Мельнікаў, Уладзімір Арлоў. З дапамогай сяброў яны ўсталявалі на гэтым гістарычным месцы каменны мемарыял. З часам фестываль стаў народнай традыцыяй, людзі з розных куткоў Беларусі збіраюцца тут, каб ушанаваць памяць аб продках.

У гэтым годзе, як і заўжды, свята сабрала шмат знакамітых на Беларусі людзей, на сцэне выступілі барды В. Бартосік, А. Мельнікаў, магіляўчане П.Пастухоў, В.Аўраменка, П.Шулягін, пісьменнік-гісторык У.Арлоў ды іншыя. А пасля заканчэння афіцыйнай часткі мерапрыемства моладзь усю ноч танчыла на дыскатэцы, дзе гучала толькі беларуская музыка.

Вольга ВАЙТУСЁНАК, студэнтка журфака БДУ.

крыжаванка ад любові іонавай

ПЕРАКЛАДЗІЦЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 1. Вождь. 4. Честь. 7. Щур (птица). 9. Мошенник. 10. Композитор. 11. Натрий. 15. Сахар. 18. Мастер. 19. Ералаш. 21. Фольклор. 26. Друг. 27. Доверие. 28. Воротник. 31. Скорняк. 32. Лицо. 34. Корь. 36. Четверг. 37. Произведение. 39. Мрамор. 40. Печатник.

ПА ВЕРТЫКАЛІ. 2. Шорник. 3. Автор. 4. Землекоп. 5. Намерение. 6. Сплетник. 7. Шурин. 8. Фонарь. 12. Сундук. 13. Юмор. 14. Хозяин. 16. Кипяток. 17. Борец. 20. Пескарь. 22. Клир (церк.). 23. Владелец. 24. Мельник. 25. Паперть. 26. Священник. 29. Кожевенник. 30. Чаща. 31. Костер. 33. Царь. 35. Зверь. 38. Водоворот.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Тыраж 2 093 экз. Заказ 2493. Падпісана да друку 28. 10. 2002 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе.

Аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку» (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя, тэл./факс), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82.